# Рэха Берасцейшчыны

ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

БУДЗЬМА!

№ 1 (3) ЖНІВЕНЬ 2009



У НУМАРЫ:

Юбілеі Берасцейшчыны 1, 4-8

Берасцецы— дзеячы БНР 10-11

Барацьба з рэлігіяй 1945-65 16-17


# БЕРАСЦЕ, БРЭСТ-ЛІТОЎСК, БРЭСТ-НАД-БУГАМ, БРЭСТ...

## Да 990-годдзя ад першага ўпамінання Берасця ў летапісах

**Горад Берасце ў гэтым годзе адзначае юбілей – 990 гадоў. Гэтая дата шырока адзначаецца грамадскасцю рэгіёна, ладзіцца шмат розных мерапрыемстваў, прымеркаваных да гэтага свята. Давайце ж і мы пройдземся гістарыч-нымі этапамі развіцця Берасця.**

**? Калі ўпершыню згадваецца горад Берасце, якая яго ранняя гісторыя?**

Упершыню горад згадваецца пад назвай Берестье (бел. Берасце) ў 1019 годзе ў “Аповесці мінулых гадоў”. Узнік ён на тэрыторыі рассялення ўсходнеславянскага племяннога аб’яднання дрыгавічоў. Горад быў буйным гандлёвым цэнтрам Кіеўскай Русі на мяжы з польскімі і літоўскімі ўладаннямі. У XI – XII стагоддзях горад належаў тураўскім, кіеўскім, уладзіміра-валынскім і галіцка-валынскім князям. У 1020 годзе быў захоплены польскім князем Баляславам Храбрым, у 1044 годзе Яраслаў Мудры вярнуў Берасце ў Кіеўскае княства.

У выніку археалагічных раскопак было выяўлена Берасцейскае гарадзішча (на тэрыторыі Валынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці). Былі раскапаны вуліцы з драўляным насцілам, рэшткі больш як 200 жылых і гаспадарчых пабудоў. Сёння частка з іх закансервавана і знаходзіцца ў вельмі ўнікальным музеі “Берестье”, які і дазваляе нам сёння праз стагоддзі зазірнуць у раннюю гісторыю горада. А гісторыя Берасця нават XI-XIII стагоддзяў сведчыць аб яго вельмі шпаркім развіцці і гандлёвых адносінах з самымі рознымі краінамі як на Захадзе, так і на Усходзе.

**? Як сталася, што першапачатковая назва Берасце знікла, а з’явілася сучасная Брэст?**

Па адным з тлумачэнняў, назву Брэст горад атрымаў праз спецыфіку польскай мовы – польскі варыянт назвы запісваўся як Brześć, потым ён быў перанесены ў рускую мову (XIX ст.) як Брест, потым – у беларускую як Брэст. Таксама ў Расійскай імперыі ўжывалася назва Брэст-Літоўск. У 1921 годзе горад атрымаў новую назву — Брэст-над-Бугам, якая праіснавала да 1939 года.



**Берасце, адлюстраванае на гравюры Э. Дальберга 1657 г.**

**? Як адбывалася развіццё Берасця ў складзе Вялікага княства Літоўскага?**

У склад ВКЛ г. Берасце ўвайшоў у 1319 годзе пры вялікім князі Гедзіміне. Потым горад часова пераходзіў да Польшчы, у 1379 годзе яго разрабавалі і спалілі тэўтонскія рыцары.

У 1390 годзе Берасце першым сярод сучасных беларускіх гарадоў атрымаў Магдэбургскае права на самакіраванне. Гэтае права звычайна надавалася як заахвочванне да лепшага парадку і развіцця горада, а таксама як узнагарода мяшчан за іх заслугі. Магдэбургскае права зрабіла г. Берасце самастойнай адміністрацыйнай адзінкай са сваімі атрыбутамі – тэрыторыяй, грамадзянствам, інстытутамі ўлады і суда, гербам, падатковай сістэмай і г. д. Уся ўлада ў горадзе належала органам гарадскога самакіравання. У казну горада ішлі даходы ад крам. Мяшчане Брэста мелі эканамічныя льготы, вызваляліся ад некаторых падаткаў. Карацей, Магдэбургскае права надало штуршок для больш хуткага развіцця сярэдняевечнага Берасця.



**Сучасны сцяг Берасця**

Значэнне Берасця, як геапалітычнага цэнтра ў складзе ВКЛ, было вялікім. Аб гэтым сведчыць тое, што менавіта ў Берасці ў 1409 годзе вялікія князі Ягайла і Вітаўт разам з татарскім саюзнікам Саладзінам абмяркоўвалі план выправы на крыжакоў.

**Павел ДАЙЛІД.**
**г. Івацэвічы.**

*(Працяг на стар.5)*

# КАЛОНКА РЭДАКТАРА



**Шаноўнае спадарства!**

Вы трымаеце ў руках трэці нумар гісторыка-культуралагічнага бюлетэня «РЭХА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ».

З кожным нумарам паляпшаецца якасць і дызайн нашага выдання і вельмі добра тое, што да гэтага спрычыніліся і вы— нашыя чытачы. Дзякуем вам за парады і заўвагі, якія мы абавязкова і надалей будзем улічваць падчас падрыхтоўкі газеты.

Таксама, рэдакцыя вельмі ўдзячная краязнаўцам Берасцейшчыны, многія з якіх становяцца ўжо нашымі традыцыйнымі аўтарамі. Але рады вітаць і новых даследчыкаў, аматараў роднай гісторыі.

Гэты год удаўся вельмі багатым на юбілеі на Берасцейшчыне. Гэтак, сёлета мы святкуем 990-годдзе Берасця, 600-годдзе Белавежскай пушчы, 490-годдзе Івацэвічаў...

Важнай падзеяй для Берасцейшчыны з'яўляецца і тысячагоддзе Літвы.

Аднак мы засяродзілі ўвагу не толькі на юбілейных падзеях, друкуем тут і цікавыя даследаванні нашых аўтараў на самыя розныя тэмы.

Як паказвае час, водгукі чытачоў, «РЭХА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ» ўжо цвёрда займае сваю нішу ў прасторы гісторыка-культурнай інтэрпрэтацыі нашага мінулага, таму рэдакцыя сёння з упэўненасцю глядзіць у будучыню, дзеля якой вельмі важна захаванне мінулага.

З упэўненасцю падкрэслім, што мы будзем развівацца і даносіць да чытачоў апошнія тэндэнцыі ў вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны Краю.

І надалей мы заахвочваем аўтараў, краязнаўцаў, гісторыкаў, пісьменнікаў, паэтаў і ўсіх неабыякавых да краязнаўства асобаў дасылаць нам свае творы, каб узбагаціць духоўную спадчыну Берасцейшчыны.

Чакаем вашыя лісты па адрасе **225295 г.Івацэвічы, а/с 41,** або на электронны адрас **dajlid@mail.ru**.

***Павел ДАЙЛІД,***
**рэдакцыя «Рэха Берасцейшчыны»**

# КРАЯЗНАЎЧЫЯ САЙТЫ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

**У імклівым XXI стагоддзі важнай крыніцай інфармацыі з'яўляецца інтэрнэт. На сённяшні дзень ён усё больш пранікае ў наша жыццё. У сувязі з гэтым мы прапануем вам азнаёміцца з двумя сайтамі, якія працуюць у краязнаўчым рэчышчы.**

У сённяшнім выпуску мы спыніліся на сайтах Ганцавіцкага краязнаўчага музея і музея-сядзібы "Пружанскі палацык". Трэба адзначыць, што гэтыя сайты найбольш паспяхова прадстаўляюць музеі Берасцейшчыны ў віртуальнай прасторы.

На гэтых старонках чытач можа знайсці інфармацыю аб музеі і яго паслугах, навінах краязнаўства ў рэгіёне. Акрамя таго, на сайтах выкладзена багата краязнаўчага матэрыялу, артыкулаў, пэўных выданняў, якія тычацца дадзенага рэгіёну.

Прыхільнасць да беларушчыны робіць сайты Ганцавіцкага і Пружанскага музеяў вельмі важнымі інструментамі патрыятычнага выхавання, распаўсюду духоўнай спадчыны рэгіёну сярод наведвальнікаў віртуальнай прасторы, папулярызацыі турызму.

Ганцавіцкі краязнаўчы музей створаны ў 1997 годзе. Адкрыты для наведвальнікаў у 2002 годзе да 120-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Асноўны фонд музея (на 01.01.2009г.) налічвае 2083 адзінак захоўвання, навукова-дапаможны — 2501 адзінак. Плошча экспазіцыі 146 м².

Музей-сядзіба "Пружанскі палацык" – адзіная адноўленая сядзіба такога тыпу ў Беларусі! Аснова канцэпцыі экспазіцыі музея – узнаўленне інтэр'ераў гарадской сядзібы XIX стагоддзя. У 2008 годзе споўнілася 15 гадоў ад дня заснавання музея.

Болей інфармацыі вы атрымаеце на сайтах музеяў:

**http://gants-museum.ucoz.com/**
**http://museum.pruzhany.com/**




**http://gants-museum.ucoz.com/ — сайт Ганцавіцкага краязнаўчага музея.**




**http://museum.pruzhany.com/ — сайт музея-сядзібы "Пружанскі палацык".**

# НАВІНЫ КАМПАНІІ “БУДЗЬМА” НА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЕ

## Дударскія матывы на “Лясным возеры”

**Канцэрт барда і дудара Змітра Сідаровіча прайшоў 11 ліпеня на турбазе “Лясное возера” Баранавіцкага р-на.**



На гэты канцэрт прыйшлі не толькі людзі, якія адпачываюць на турбазе, але і турысты, што спыніліся непадалёк.

З. Сідаровіч апавядае: “Турысты – народ своеасаблівы. Гэтыя людзі па-свойму праяўляюць сацыяльную актыўнасць. Першы іх пастулат – не сядзець дома!

Мала хто, на жаль, надае належнае значэнне беларускай мове, але людзі цікавяцца краязнаўствам. Ад краязнаўства да беларускай мовы – адзін крок, які дапамагаюць зрабіць такія сустрэчы.

Даводзіцца працаваць – аўдыторыя не проста пасіўна слухае, але спрачаецца з табой і нават палемізуе. Ловіць кожнае слова. Даказваеш свой пункт погляду проста са сцэны, пункт погляду на праблемы беларускай мовы і культуры.

Добра, калі ўсё гэта робіш на фактах уласнай біяграфіі. Яшчэ лепей за самыя палымяныя прамовы пераконваюць старажытны беларускі інструмент дуда і практычны ўрок народных танцаў”.

Таксама сваю падзяку бард выказвае адміністрацыі турбазы “Лясное возера” і арганізатарцы культурнай працы Настассі Уладзіміраўне Крамянёўскай.

**Арына ЛІСЕЦКАЯ,**
**budzma.org**

## Паэт павінен нараджацца ў вёсцы

**Літаратурная сустрэча з пісьменнікам Уладзімірам Някляевым і паэткай Валярынай Куставай адбылася 31 ліпеня ў беларускамоўным летніку “Чароўны дом Еўрапейскіх сустрэч”, які знаходзіцца ля вёскі Залессе Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.**

Выступ адбываўся на прыродзе.

У. Някляеў апавядаў пра сваё станаўленне як паэта, разважаў, як знайсці сваё месца ў гэтым свеце.

Імпрэза доўжылася каля трох гадзін.

На сустрэчы прысутнічала каля 30 чалавек. У асноўным гэта былі студэнты ці тыя, хто толькі скончыў ВНУ.

Асабліва былі ўражаныя слухачы, якія спецыяльна прыехалі з найбліжэйшых вёсак Высокае і Камянец. Яны шчыра былі здзіўленыя, што так далёка ад “цэнтра Беларусі” ладзяцца такія прыгожыя сустрэчы.

В. Кустава падзялілася сваімі ўражаннямі: *“Гэта быў першы раз, калі я апынулася ў беларускай вёсцы, першы раз начыла ў сапраўднай беларускай хаце і першы раз, калі мне давялося браць ваду з калодзежа. Атмасфера вёскі проста ўражвае. Калі ты выступаеш на вольным паветры, адчуваеш небывалую прастору. Тут гусі ходзяць, там коні ржуць – не кожны верш прачытаеш у такой атмасферы. Хочацца чытаць нешта разняволенае, палётнае, што мае прастору. Урэшце я зразумела словы А.Сыса, які казаў, што паэт павінен нараджацца ў вёсцы”.*



Імпрэза ладзілася ў межах кампаніі “Будзьма беларусамі!”

**Арына ЛІСЕЦКАЯ,**
**budzma.org.**
**Фота Валерыі Куставай.**

## Міхась Скобла і Іна Снарская на Лунінеччыне

**Паэты Міхась Скобла і Іна Снарская выступілі 2 жніўня на Берасцейшчыне – у летніку “Спадарожнік” і на базе адпачынку “Белае возера” Лунінецкага раёна.**

Іна Снарская (аўтарка шасці паэтычных зборнікаў) нарадзілася ў Полацку, але ўжо дваццаць гадоў жыве ў Палтаве (Украіна). Яна брала ўдзел у V З’ездзе беларусаў свету, наведала сваю малую радзіму, а вандроўка на Лунінеччыну сталася для яе прыемным сюрпрызам:

“Падобныя сустрэчы для мяне – як ратаванне. Украіна даўно мне не чужая, мяне там перакладаюць і выдаюць, але пішу я па-беларуску, таму вельмі ўдзячная беларускім сябрам за гэтыя цудоўныя спатканні. Паэту жывы водгук неабходны. Каб вы толькі бачылі, як дзеці скандавалі “Будзьма беларусамі!”, як актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах! Заўтра я ад’язджаю ў Палтаву, але ўспамін пра гэтую сустрэчу будзе сагравацьмяне доўга-доўга”.

Міхась Скобла прызнаўся, што на Лунінеччыну прыехаў не ўпершыню: *“Відаць, не засталося ў Лунінецкім раёне школаў, куды б за мінулыя некалькі гадоў не наведаліся беларускія пісьменнікі і музыкі. Мы тут былі з віяланчэлістам Ігарам Алоўнікавым, бардам Алесем Камоцкім, выканаўцай народных песняў Наталляй Матыліцкай… Усе літаратурныя святы тут наладжваюцца ўлюбёным у беларускую паэзію чалавекам – Таццянай Васільеўнай Канапацкай. Калі яна ладзіць сустрэчу – значыць, зала будзе поўная, атмасфера ў ёй будзе адпаведна ўзнёслая. Так было і гэтым разам. Я з удзячнасцю прысвяціў спадарыні Таццяне верш, які пачынаецца радкамі: “У імя Святога Духа, Сына і Айца пройдзе хай бяда і скруха міма Лунінца!” Лунінеччына – дзівосны край, дзе, падобнае да жырандолі, свеціцца чысцюткае Белае возера, дзе вёскі называюцца Вулькамі (а Вулька – гэта Воля, Свабода), дзе жыў Якуб Колас і бываў Аляксандр Блок”.*



**Удзельнікі сустрэчы—фота на памяць**

Пераможцы конкурсаў атрымалі падарункі з эмблемай кампаніі “Будзьма беларусамі!”.

**budzma.org.**

# ТЫСЯЧАГОДДЗЕ ЛІТВЫ — СВЯТА І ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Літва, суседка нашай краіны, адзначае тысячагоддзе. У пачатку ліпеня з гэтай нагоды ў Вільні адбыліся ўрачыстасці, на якіх прысутнічалі многія кіраўнікі еўрапейскіх дзяржаў. Між іншымі, гасцямі на свяце ў Літве пабывалі каралева Даніі Маргрэтэ II, кароль Нарвегіі Харальд V, кароль Швецыі Карл XVI Густаў. У мерапрыемствах удзельнічалі таксама прэзідэнты Ісландыі, Латвіі, Польшчы, Украіны, Фінляндыі, Грузіі, прэм'ер-міністр Эстоніі, міністр культуры Расіі, міністр абароны Германіі. Беларусь прадстаўляў міністр культуры Павел Латушка.**



**"Пагоня"—герб Вялікага княства Літоўскага, адлюстраваны на Статуце 1588 года.**

Святкаванне міленіўму (тысячагоддзя) Літвы некаторыя грамадскія дзеячы, гісторыкі прапануюць праводзіць і ў Беларусі. Створаны нават такі грамадскі арганізацыйны камітэт святкавання гэтай падзеі ў Беларусі. Здаецца дзіўным? Але гэта абсалютна лагічна. Бо Літва сённяшняя – гэта зусім не тая Літва, якая была тысячу гадоў таму. Але ўсё па-парадку.

**У сувязі з якімі падзеямі ўпершыню згадваецца Літва?**

Першае ўпамінанне Літвы звязана з трагічнымі падзеямі. Пісьмовым дакументам, у якім пад 1009 годам згадвалася Літва, былі Кведлінбургскія аналы. У гэтай гістарычнай крыніцы распавядаецца аб тым, што 14 лютага 1009 года дзесьці на мяжы Русі і Літвы загінуў вядомы прапаведнік біскуп Бруна-Баніфацый. Гэты місіянер прапаведаваў хрысціянства сярод язычнікаў-славянаў, качэўнікаў печанегаў, бываў ён у Польшчы і Кіеўскай Русі.

І вось падчас чарговай сваёй пропаведзі "на мяжы Русі і Літвы" біскуп Бруна разам са сваімі 18 спадарожнікамі быў забіты язычнікамі. Ужо пазней Бруна-Баніфацый Папам Рымскім і Каталіцкай Царквой быў прылічаны да святых, як пакутнік за веру.

**А пры чым жа тут Беларусь?**

Справа ў тым, што на працягу многіх стагоддзяў Літвой называліся паўночна-заходнія і цэнтральныя землі сучаснай Беларусі. А на тэрыторыі сучаснай Літоўскай Рэспублікі да тагачаснай Літвы адносіліся невялікія землі на паўднёвым усходзе – Віленшчына.

Гэта значыць, што этнічная Літва знаходзіцца на тэрыторыі сённяшняй Беларусі.

А тэрыторыя сённяшняй Беларусі ў сярэднявеччы аж да XIX стагоддзя падзялялася на такія часткі, як ужо згаданая Літва (Паўночна-Заходняя і Цэнтральная Беларусь), Русь, або пазней Белая Русь (Паўночна-Усходняя Беларусь), Палессе (Паўднёвая Беларусь), Падляшша (Паўднёва-Заходняя Беларусь).

Такім чынам, калі праводзіць мяжу паміж Літвой і Руссю пачатку XI стагоддзя, то яна пройдзе якраз па тэрыторыі сучаснай Беларусі. Таму пакутніцкая смерць Бруна-Баніфацыя магла адбыцца і на Беларусі.

**Дзе ж цэнтр Літвы?**

Сёння кожны школьнік ведае, што першай сталіцай Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) быў Навагрудак, дзе правіў князь Міндоўг, які нават каранаваўся тут у 1253 годзе каралеўскай каронай. Менавіта Навагрудчына стала ядром ВКЛ – адной з буйнейшых сярэднявечных дзяржаў Еўропы. І менавіта сучасныя беларускія землі складалі аснову ВКЛ. Не верыце? Зазірніце ў школьны атлас.

І яшчэ ў XIX стагоддзі ўраджэнец Навагрудчыны Адам Міцкевіч адну са сваіх паэм пачынаў словамі: "Літва! Мая Айчына..." У гэтым выпадку славуты паэт і меў на ўвазе менавіта Навагрудчыну, першапачатковую Літву.

**А дзе была сучасная Івацэвіччына?**

Якраз праз тэрыторыю сучаснай Івацэвіччыны праходзіла ў сярэднявеччы мяжа паміж Літвой і Палессем. Гэтую мяжу яшчэ і сёння вельмі добра адчуваюць вучоныя-дыялектолагі.

У адным з дакументаў 1570 года маёнтак Косава (зараз у Івацэвіцкім раёне) аднесены да ўласна Літвы і адрозніваецца ад "палескіх маёнткаў". Паводле этнаграфічных запісаў XIX стагоддзя насельніцтва на поўдзень ад Выганаўскіх балот (сённяшняя Целяханшчына) лічыла тых, хто жыў на поўнач ад іх, ліцвінамі, а сябе палешукамі.

Такі падзел нашага раёна на палескую зону (Целяханшчына) і на ліцвінскую, або беларускую (Івацэвіччына, Косаўшчына) існуе і сёння.

**Чыя ж дзяржава ВКЛ?**

ВКЛ было агульнай славяна-балцкай дзяржавай. Пры гэтым жамойты (балцкае племя), продкі сучасных літоўцаў, увайшлі ў ВКЛ толькі ў 1413 годзе. З гэтага часу поўная назва ВКЛ – Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Калі гэтую назву перакласці на сучасную мову, то яна будзе гучаць як "Вялікае княства Беларускае, Украінскае і Літоўскае". Бо фактычна Літвой тады была Беларусь, Украінай – Русь, а Жамойць – гэта сённяшняя Літва.

Пры ўсім гэтым, агульнай, асноўнай для ВКЛ была старабеларуская культура. А старабеларуская мова тады была мовай арыстакратаў. І нават, можна сказаць, больш таго, яна была мовай міжнароднай перапіскі. У сярэднявеччы з Еўропы ішлі лісты ў ВКЛ па-беларуску, нароўні з тымі, што былі напісаныя на лаціне. Дарэчы, у XVII стагоддзі вядомы праваслаўны дзеяч Лаўрэнцій Зізаній разумеў пад "літоўскай" мовай старабеларускую, а пад "рускай" – царкоўнаславянскую.

**Чаму сённяшнія беларусы не называюць сябе ліцвінамі?**

Тэрмін "беларус" пачаў замацоўвацца за ліцвінамі менавіта пасля ўваходжання ці, правільней сказаць, акупацыі зямель ВКЛ Расійскай імперыяй ў канцы XVIII стагоддзя. Пасля захопу ліцвінскіх зямель расійскай адміністрацыяй пачаў тут насаджацца тэрмін "Северо-Западный Край".

Дарэчы, ВКЛ і Масковія, а пазней Расія на працягу ўсяго сярэднявечча між сабою ваявалі. Чаму? Таму што абедзьве гэтыя дзяржавы ў той час прэтэндавалі на вядучую ролю ў аб'яднанні ўсходнеславянскіх зямель вакол сябе. Пры гэтым не сённяшняя Расія, а Украіна – гэта тагачасная Русь. Назву ж "Расія" перацягнула на сябе з часам Масковія, каб мець больш падставаў прэтэндаваць на спадчыну Кіеўскай Русі.

ВКЛ і Масковія біліся між сабою вельмі зацята. Напрыклад, падчас вайны 1654-1667 гадоў маскавіты знішчылі больш за палову жыхароў сучаснай Беларусі. Кожнага другога...

У гэтай геапалітычнай барацьбе перамагла Масковія-Расія. І, як кажуць, пераможцаў не судзяць. Што пачала рабіць Расія з землямі Літвы? Асімілёваць, набліжаць да сябе, рабіць падобнымі да сябе. Успомніце, што сказаў М. Мураўёў, душыцель паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага 1863-1864 гадоў: "І калі вы, спадарства, не адчуеце сябе тут рускімі, то вы будзеце тут замежнікамі і павінны будзеце пакінуць гэты край". Або: "Што не зрабіў рускі штык – зробіць руская школа". Вельмі выразная "братэрская" пазіцыя...

У выніку, дайшло да таго, што ўжо ў XX стагоддзі зацятыя ворагі ліцвіны і маскавіты сталі братэрскімі народамі – беларусамі і рускімі...

**Дык тысячагоддзе Літвы – свята для Беларусі?**

Можна сказаць так на ўсе сто працэнтаў. Беларусы – спадчыннікі Вялікага княства Літоўскага, дзяржавы, што ў сярэднія вякі прасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора. Дзяржавы, у якой сённяшнія беларусы (=ліцвіны) былі тытульнай народнасцю.

Таму са святам, ліцвіны!

**Павел ДАЙЛІД. г. Івацэвічы.**

# БЕРАСЦЕ, БРЭСТ-ЛІТОЎСК, БРЭСТ-НАД-БУГАМ, БРЭСТ...

## Да 990-годдзя ад першага ўпамінання Берасця ў летапісах

*(Працяг. Пачатак на стар.1)*

Так што без сумнення можна сёння заявіць, што план перамогі над тэўтонамі пад Грунвальдам каваўся яшчэ на гэтай нарадзе ў Берасці.

У 1441 годзе прывілеем г. Берасце быў аднесены да галоўных гарадоў ВКЛ.

У 1553 годзе берасцейскі староста М. Радзівіл Чорны заснаваў тут кальвінскі збор і першую на тэрыторыі сённяшняй Беларусі друкарню, якая ў 1563 годзе выдала так званую "Берасцейскую Біблію", што на той час была адным з найлепшых выданняў у ВКЛ і Польшчы.

У 1596 годзе ў Берасці была заключана царкоўная унія, пагадненне пра аб'яднанне праваслаўнай царквы з каталіцкай на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Увогуле, у XIV-XVIII стагоддзях у Берасці існавалі касцёлы і кляштары аўгусцінцаў, бернардзінаў, брыгітак, дамініканаў, трынітарыяў, уніяцкія цэрквы і манастыры.

У 1615 годзе ў Берасці з'явілася езуіцкая місія, пры якой з 1633 года дзейнічаў Берасцейскі езуіцкі калегіум.

У 1653 годзе ў Берасці засядаў сойм Рэчы Паспалітай – тагачасны парламент нашай дзяржавы.

А ў 1665-1666 гадах у Берасці працаваў нават манетны двор, які за год выпусціў медных солідаў на суму больш чым 2,5 мільёна злотых.

### ? Якія змены перажываў горад падчас уваходжання нашых зямель у склад Расійскай імперыі?

Берасце трапіў у склад Расіі ў 1795 годзе паводле трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі горад Берасце страціў Магдэбургскае права на самакіраванне. Справа ў тым, што гарады Расійскай імперыі такога права ніколі і не мелі.

А ў 1830-1840-х гадах Берасце быў разбураны, на яго месцы была збудавана Брэсцкая крэпасць. Яшчэ і сёння многія даследчыкі, нават энцыклапедыі аб гэтым кажуць вельмі суха: горад быў перанесены на тры кіламетры на ўсход, а на яго месцы збудавалі крэпасць.

Аднак гэтую падзею можна разглядаць і як трагічную старонку гісторыі горада. Берасце з ягонай унікальнай еўрапейскай забудовай быў знішчаны, бо не ўпісваўся ў традыцыі расійскай архітэктуры, таму царызм і вырашыў сцерці непаўторную адметнасць горада, пабудаваўшы крэпасць у імперскім духу і горад у іншым месцы з тыпова расійскай забудовай.



**Удзельнікі падпісання Брэсцкага мірнага дагавору ў 1918 годзе.**

### ? Якія падзеі навейшага часу займаюць важнае месца ў гісторыі Берасця?

Трэба адзначыць, што ў XX стагоддзі Берасце быў таксама арэнай важных падзей. Гэтак, у 1918 годзе ў Брэст-Літоўску быў заключаны мірны дагавор Савецкай Расіі з Германіяй і яе саюзнікамі. Гэты мірны дагавор фармальна завяршыў перыяд удзелу Расіі ў Першай сусветнай вайне. Паводле гэтага дагавору значная частка Беларусі (у тым ліку і Брэст) адышла да Германіі.

У 1919 годзе Брэст быў заняты польскімі войскамі і паводле Рыжскага дагавору (1921 год) разам з заходнебеларускімі землямі знаходзіўся ў складзе Польшчы. Падчас польскай акупацыі Берасце пачалі называць Брэст-над-Бугам.

А ў 1939 годзе Брэст быў захоплены немцамі падчас іхняга паходу на Польшчу. Аднак, згодна з сакрэтным пагадненнем паміж фашысцкай Германіяй і камуністычным СССР аб размежаванні сфераў уплыву, 22 верасня 1939 года Брэст быў перададзены Савецкаму Саюзу. Дарэчы, у тым 1939 годзе ў Брэсце адбыўся сумесны нямецка-савецкі парад, падчас якога нямецкія і савецкія камандуючыя нават абмяняліся сцягамі.

Але ўжо ў 1941 годзе былы сябар Савецкага Саюза Германія парушыла дагавор і распачала аперацыю "Барбароса", падчас якой Брэст адным з першых зведаў удар нямецкай ваеннай машыны. А гераічная абарона Брэсцкай крэпасці стала старонкай мужнасці ў нашай гісторыі.



**Царква Св. Мікалая, дзе ў 1569 годзе была заключана Брэсцкая унія.**



**Музей "Берестье" сёння захоўвае памяць тысячагадовай гісторыі горада.**

У 1965 годзе Брэсцкай крэпасці было прысвоена ганаровае званне "крэпасць-герой". І ў 1969 – 1971 гадах на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці быў утвораны мемарыяльны комплекс, які ўвекавечыў подзвіг яе абаронцаў.

**Павел ДАЙЛІД. г. Івацэвічы**

# БЕЛАВЕЖСКІЯ

## Нацыянальнаму парку “Белавежская

**Белавежская пушча – адзін з найбуйнейшых і старажытных лясных запаведнікаў Еўропы. Паводле сведчання гісторыка Паўла Шпілеўскага, такую назву пушча атрымала ад старажытнага мураванага замка з прыгожымі белымі вежамі, які ўзвёў у XIII ст. яцвяжскі князь у цэнтры лясного гушчару. Аднак гэта толькі адна з версій – да канца гэта пытанне не высветлена і па нашыя дні.**



**Белавежская сядзіба. XVIII ст.**

З XIV ст. пушча стала месцам паляванння вялікіх князёў літоўскіх. Вядома, што сюды неаднойчы наведваўся Вітаўт Вялікі. Менавіта ў пушчы ў 1409 г. напярэдадні Грунвальдскай бітвы сустракаліся гаспадар Літвы з каралём польскім Ягайлам-Уладзіславам. Паляванне было яркім дадаткам да афіцыйнага мерапрыемства – Берасцейскай сустрэчы, дзе браты-манархі дамовіліся аб ваеннай кампаніі, так званай “Вялікай вайне” 1409 – 1411 г.г. з Тэўтонскім ордэнам. Імі было таксама загадана весці ў Белавежскай пушчы нарыхтоўку мяса для шматлікага польска-ліцвінскага войска. Мяса салілі ў дзежкі і па рэках Нараў і Вісла на барках сплаўлялі ў Плоцк на запас для будучай вырашальнай вайны з крыжакамі. Да таго ж для папаўнення конніцы адлоўлівалі тарпанаў. Другі раз Ягайла наведаўся ў Белавежскі край разам са сваім вялікім дваром у 1425 г., хаваючыся ад эпідэміі.



**Стэфан Баторый у Белавежскай пушчы.**

З тых пор усе польскія каралі і вялікія князі літоўскія рабілі сюды пастаянныя паляўнічыя ваяжы на зуброў, тураў, аленяў. Бывалі часы, што лясныя шаты рабіліся ў небяспечныя часы прытулкам-сховішчам для розных людзей – манархаў, шляхецкіх сем’яў, сялян-уцекачоў і разбойнікаў.

Кіраўнікі дзяржаў разумелі, што безгаспадарчыя і толькі спажывецкія адносіны да пушчы хутка знішчаць яе. Таму дзеля рэгулявання пушчанскай гаспадаркі выдаваліся спецыяльныя дакументы. Законы ў першую чаргу тычыліся каштоўных парод звяроў – зубраў і баброў. Напрыклад, першы звод законаў ВКЛ Судзебнік Казіміра IV Ягелончыка 1468 г. прадпісваў аберагаць баброў, а статут 1588 г. прыроўніваў забойства зубра да сур’ёзнага крымінальнага злачынства. Пры Жыгімонце І у 1538 г. быў прыняты закон “Аб захаванні лясоў і палявання”, распараджэнне Уладзіслава IV ад 1640 г. забараняла высечку пушчанскага лесу.

Прыезды манархаў у пушчу заўсёды з’яўляліся неардынарнай падзеяй. Канешне, такія асобы жадалі не толькі паляваць, але і ўтульна адпачываць. Тым больш, што наведваліся яны сюды са знатнымі гасцямі і прыдворнымі.

Так, адным з першых у пачатку XVI ст. пабудаваў у пушчы драўляны палац вялікі князь літоўскі Аляксандр для сваёй жонкі Алены Іванаўны Маскоўскай. Аднак, паводле крыніц, праіснаваў ён нядоўга – пасля 1554 г. на будынак напалі раз’юшаныя зубры і разбурылі яго.

Новы раскошны паляўнічы палац з флігелямі і белымі вежамі з’явіўся на ўзвышшы каля мястэчка Нараўка пры Жыгімонце І Старым. Лічыцца, што менавіта пры ім у 1541 г. Белавежская пушча набыла статус паляўнічага заказніка. Дарэчы, гэта быў першы падобны прэцэдэнт у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

У 1581 г. кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый непадалёку ад Старога Белавежа, дзе стаяў палац Жыгімонта, узвёў новы замак Biała wieża, які таксама меў белыя вежы-прыгажуні. Пры Баторыі каля вытокаў р. Ялянка ўзнік першы каралеўскі паляўнічы звярынец і так званая Баторыева Гара. Пры ім жа ў канцы XVI ст. пушча стала мець уласнае кіраўніцтва на чале з галоўным ляснічым і спецыяльную варту, што змяшчаліся ў асноўным у фальварку Ямна каля паселішча Каралеўскі Мост.

Цікава, што зямля Пружаншчыны, на тэрыторыі якой і цяпер знаходзіцца значная частка масіву Белавежскай пушчы, захавала шмат сведчанняў па гісторыі старадаўняга лесу. Вядома, што ў самых Пружанах у XVI – XVII ст.ст. існаваў драўляны двор, дзе спыняліся манархі, што ехалі на паляванне, тут жа змяшчаліся некаторыя адміністратары пушчы. Падобны аб’ект існаваў у Шарашове. З пушчай звязваюць некаторыя назвы геаграфічных аб’ектаў раёна. Вось толькі некаторыя з іх. Як сведчыць мясцовая легенда, назва вёскі Стараволя ідзе ад слова “воля”, якую тут атрымалі старыя вартаўнікі пушчы, што ахоўвалі Вялікі гасцінец – гандлёвы шлях з Кракава ў Вільню. Тапонім Роўбіцк нібыта ўтвораны ад імя Роўба. Падобным словам называлі аднагодкаў, равеснікаў, роўных ростам. Вёска ўпамінаецца пад 1559 г. у “Рэвізіі пушчаў і звярыных пераходаў”, дзе запісана, што Роўбіцкі жрэбій (свабодны ўчастак) быў аддадзены Жыгімонтам II Аўгустам для пражывання 10 сем’яў стралкоў ляснай варты, якія ахоўвалі пушчу і займаліся падрыхтоўкай каралеўскіх паляванняў.

Новы ўздым будаўніцтва ў пушчы назіраўся пры каралі польскім і вялікім князі літоўскім Аўгусце III Саксонскім у сярэдзіне XVIII ст. Быў значна перабудаваны і пашыраны ранейшы каралеўскі звярынец, які атрымаў назву Аўгустаў сад. На яго тэрыторыі ўзвялі альтанкі для манарха і яго світы. З’явіўся новы паляўнічы замак на ўзвышаным беразе р.Нараўка. Ён быў абкружаны прыгожым паркам і лугам з вялікімі дубамі. Рэзідэнцыя была разлічана на прыём вялікіх гасцей – мелася вялізная зала з камінам, па баках ад якой месціліся ўтульныя, з высокамастацкай аздобай, пакоі для адпачынку. Аўгуст III некалькі разоў прыязджаў на паляванне ў пушчу. У гонар аднаго з паляванняў ў 1752 г. на правым беразе Нараўкі недалёка ад замка быў пастаўлены памятны знак з белага пяшчаніку ў выглядзе трохкутнікавай піраміды ў 6 аршын вышынёю з надпісам аб тым, што кароль з каралеваю і 2 сынамі забілі 42 зубры, 13 ласёў і 2 серны. Указана была вага самага буйнога са знішчаных зуброў – 36 пудоў 10 фунтаў.

Пры Станіславе Аўгусце Панятоўскім у 1784 г. ў Аўгуставым садзе быў узведзены яшчэ адзін драўляны трохпавярховы палац-павільён. На ніжнім паверсе ў ім размяшчаліся слугі, у сярэднім знаходзілася вялікая зала для караля, а верхні ўяўляў сабой адкрыты балкон, з якога прыдворныя маглі назіраць за паляваннем. Некалькі разоў прыязджаў у старадаўні лес апошні манарх Рэчы Паспалітай, аднак вынішчаў жывёл не ў такой колькасці, як яго папярэднікі.



**Белавежская пушча. Паляўнічы палац Аўгуста III.**

# ПАЛАЦЫ

## пушча” спаўняецца 600 гадоў

Пасля 1795 г. пушча перайшла ва ўладанне Расіі. Цяпер яна стала месцам паляўнічых падарожжаў для імператарскай сям'і Раманавых. Праўда, і яны праяўлялі некаторы клопат аб тутэйшай фауне. Напрыклад, указам Аляксандра I ад 10 верасня 1802 г. была забаронена стральба па зубрах. Паляванне на іх забаранялася без спецыяльнага Вышэйшага дазволу. За самавольнае забойства гэтага звера пагражаў штраф у 2 тысячы рублёў ці нават высылка ў Сібір.

Не вельмі спрыяльна склаўся лёс каралеўскіх белавежскіх палацаў. У час вайны 1812 г. аўстрыйскія і саксонскія войскі разрабавалі ўсе паляўнічыя будынкі, а ў час паўстання 1830 – 1831 гг. на месцы замка была насыпана і ўстаноўлена батарэя.

У другой палове XIX ст. пачалася новая будоўля манаршай рэзідэнцыі ў Белавежскай пушчы. У 1860 г. для Аляксандра II быў пабудаваны невялікі павільён і закладзена дубовая алея вакол чыгуннага зубра, што знаходзіўся каля павільёна звярынца. Дом для імператара нагадваў сядзібу дробнага шляхціца таго часу. Менавіта ў гэтым годзе 6 – 7 кастрычніка адбылося адно з найбуйнейшых паляванняў цара і яго гасцей. Па шыкоўнай абстаноўцы і колькасці забітых звяроў гэтая падзея пераўзыходзіла ўсе папярэднія. Яго пачалі рыхтаваць за тры тыдні да прыезду імператара таварыш міністра дзяржаўных маёмасцей генерал Зялёны і егермейсцер граф Ферзен, што прыбылі са сталіцы. Лясніцтва, дамы Белавежы пераробляліся ў палаты для цара і яго світы, узводзіліся новыя пабудовы. У Белавежу для абслугоўвання палявання сцякаліся тысячы народу з ваколіц. Былі выпісаны найлепшыя паляўнічыя сабакі. А пасля прыбылі высокія госці – прынцы Карл і Альберт Прускія, Аўгуст Вюртэмбергскі, Фрыдрых Гесэн-Касэльскі, вялікі герцаг Карл-Аляксандр Саксэн-Веймарскі і сам імператар Аляксандр II. За два дні было забіта (па розных звестках) больш за 44 зубры, 50 звяроў іншых парод. У памяць аб паляванні расійскі манарх пасадзіў ліванскі кедр, а астатнія госці іншыя дрэвы.

Паводле ўказу Аляксандра III у 1889 г. каля мястэчка Белавежа Белавежска-Аляксандраўскай воласці Пружанскага павета на ўзвышаным беразе р. Нараўка быў закладзены новы паляўнічы палац. Яго ўзводзілі ўмельцы з Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Беластока. На дапаможныя работы прывозілі рабочы люд з Гайнаўкі, Крыніцы, Белага Ляска, Сухопаля, Роўбіцка, Шарашова.

Новы Белавежскі палац, які ўвасобіў у сваёй архітэктуры рысы псеўдагатычнага стылю, уяўляў сабой грандыёзны будынак у выглядзе сярэднявечнага замка з вялікімі высокімі вежамі і востраканечнымі дахамі.



**Імператарскі палац у Белавежскай пушчы. 1894 г.**

Яго ўзводзілі да 1894 г. на прывазным портлэндскім цэменце, але з выкарыстаннем мясцовай цэглы. Імператарскі палац меў два паверхі, а таксама склепы і мансарды. Мэбля для яго выраблялася з 10 парод дрэў, якія раслі ў пушчы, – сасна, елка, дуб, бяроза, ільма, граб, клён, белы бук, вольха і асіна. Дрэвам былі аздоблены плафоны, карнізы, рамкі, панэлі палаца. Для акоўкі дзвярэй і акон, усталявання люстраў, кандэлябраў і іншых металічных рэчаў служыла паліраванае і чарнёнае жалеза ў спалучэнні з меддзю.

У гэтым будынку былі самыя разнастайныя памяшканні. Адно з іх уражвала тым, што было абклеена старымі паштоўкамі з усяго свету. Вядома, што імператарскія пакоі афармляліся мастаком Ясінскім. Значная частка палаца была адведзена пад так званы малы Белавежскі Эрмітаж, дзе маглі працаваць мастакі-пейзажысты. Менавіта тут у 1892 г. чэрпаў натхненне выдатны рускі жывапісец І. Шышкін. Старадаўняму лесу Еўропы прысвечаны яго творы “Ссечаны дуб. У Белавежскай пушчы”, “Белавежская пушча. Буралом”, “Пчальнік. Белавежская пушча”. У залах палаца выстаўляліся таксама карціны рускіх і замежных аўтараў, выступалі лепшыя музычныя калектывы з Еўропы і імперыі. У пушчанскую рэзідэнцыю звозіліся разнастайныя цікавыя рэчы, у тым ліку са шляхецкіх сядзіб, што канфіскоўваліся дзяржаўнай казной. Так у Белавежскім палацы аказаліся каштоўнасці з сапегаўскіх Ружан і пружанскай сядзібы Швыкоўскіх.

За кароткі час вакол манаршай рэзідэнцыі былі ўзведзены дамы і павільёны для імператарскага акружэння, кухонныя пабудовы, стайні для коней, галерэя з пральняй і тэлефоннай станцыяй, памяшканне для гофмаршальскай службы, дом даглядчыка палаца, лядоўня, пякарня, электрастанцыя, егерскі дом і іншыя пабудовы.

Каля палаца ў 1895 г. быў закладзены вялікі англійскі парк з парод дрэў канадскай флоры і мясцовай елкі. Адначасова па праекце архітэктара Валер'яна Кроненберга ў паўднёвай частцы парку былі створаны дзве сажалкі пасля запруджвання Нараўкі.



**Галоўная вежа імператарскага палаца. 1894 г.**

На пагорку каля палаца для аздаблення былі пакладзены шматлікія валуны, абсаджаныя раслінамі-юнамі. У гэтым жа годзе ў пушчы ўзвялі праваслаўную царкву. Уся тэрыторыя палацава-паркавага ансамбля была абнесена агароджай, якая нагадвала пецярбургскую ў Летнім садзе.

Палац выкарыстоўвалі для сустрэч імператара і рускіх дыпламатаў з замежнымі манархамі і чыноўнікамі, паляванняў царскай сям'і. У 1897 г. яго наведаў Мікалай II з сям'ёй і вялікай світай у суправаджэнні гродзенскага генерал-губернатара. У час царскага палявання было забіта больш за 100 жывёл.

Значная частка імператарскага палаца сур'ёзна пацярпела ў часы І-й сусветнай вайны. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тэрыторыя Белавежскай пушчы, дзе знаходзіўся ўзгаданы палац, адыйшла да Польскай Рэспублікі. У пачатку 50-х г.г. XX ст. рэшткі імператарскага палаца былі знішчаны.

**Наталля ПРАКАПОВІЧ.**
**г. Пружаны.**

# ІВАЦЭВІЧЧЫНА І ЮНДЗІЛЫ

## Да 490-годдзя г. Івацэвічы

**Ад уладанняў знакамітага роду Юндзілаў на Івацэвіччыне засталіся толькі будынак панскай сядзібы ў раённым цэнтры ды фрагменты старасвецкага парка ў Югаліне. Юндзілы — вядомы шляхецкі род герба "Лебедзь" у ВКЛ. Яго родапачынальнік — Рачка, які жыў на мяжы XIV — XV стагоддзяў. Ён меў сына Юндзіла, ад імя якога ўтварылася прозвішча Юндзіл.**



Герб Юндзілаў — "Лебедзь".

Гісторыя гэтага магнацкага роду была цесна звязана з нашым краем...

...У 1555 годзе Мікалай Юндзіл, сын Паўла, каралеўскі дваранін ВКЛ, быў прызначаны слонімскім земскім суддзёй. Валодаў маёнткамі ў Бусяжы і Пелесам ды Ваверкаю ў Лідскім павеце.

У 1570 годзе ў актавай кнізе слонімскага земскага суда з'явіўся запіс аб падзеле ўладанняў Мікалая Паўлавіча Юндзіла паміж сынамі: *"Жадаючы пакою і згоды паміж дзецьмі, сынамі маімі Янам, Крыштафам ды Мікалаем Юндзіламі з першаю жонкаю маёю пані Ганнаю Міцуцянкаю народжанымі, таксама Абрамам, Войцехам і Ярашам, сынамі маімі з другою жонкаю маею, пані Галенаю Богушаўнаю Тушавіцкаю народжанымі, каб па смерці маёй сварак і звадак не было і да суда справа не дайшла, што шкоду братэрскім адносінам прыносіць, з добрым розмыслам маім, успакойваючы іх, учыніў паміж імі падзел вечны ў маёнтках маіх па смерці маёй гэткім чынам: сынам маім Яну, Крыштафу і Мікалаю Юндзілам запісую маёнтак мой у павеце Слонімскім ляжачы, называемы Бусяж, з людзьмі, з баярамі і з усімі землямі і пажыткамі, а сынам маім Абраму, Войцэху і Ярошу Юндзілам выдзяляю і навечна запісваю два маёнткі мае вотчынныя ў павеце Лідскім — Пелеса і Вавёркі".* (Акты, т. 22, ст. 417-418).

Паводле "Кароткай гісторыі Беларусі" (Мінск, 1978 г., ст. 286), з 1654 года роду Юндзілаў пачаў належаць маёнтак Івацэвічы.

У 1845 годзе Гродзенскім губернскім камітэтам быў зацверджаны інвентар маёнтка Івацэвічы, што належаў памешчыку Івану Юндзілу. У інвентары даецца падрабязнае маёмаснае і дэмаграфічнае становішча паселішча, адзначаецца, што *"з кожнага сялянскага двара ці сямейства выконваецца паншчыны ў тыдзень мужчына з вупражжу ці пешшу (як патрэбна будзе) 3 дні (тры дні) і жанчына 2 дні; за карыстанне лесам з усякага двара з вупражжу 2 і пеша 1 дзень у год. Звыш гэтых павіннасцей прызначана штогод з кожнага гвалтаў ці згонаў для ўборкі хлеба па 12 дзён, акрамя аднаго, які заставаўся, каб пільнаваць дом. І шарваркаў па 10 дзён з усякага двара ў год".*

У польскім Турыстычным даведніку за 1935 год паведамлялася, што івацэвіцкія Юндзілы, акрамя ворнай зямлі, валодалі вялікімі ляснымі абшарамі ў Косаўскім і Слонімскім паветах.

З родам Юндзілаў звязана гісторыя вёсак Югалін і Дабромысль. Найперш з паўстаннем 1863 — 1864 гг.

У 1825 годзе ў фальварку Югалін у сям'і Уладзіслава і Багумілы Юндзілаў нарадзіўся сын Францішак. Бацькі выбралі яму кар'еру ваеннага. Ён служыў у царскай арміі, у 1858 г. у чыне ротмістра выйшаў у адстаўку. У гэты час назіраўся ўздым нацыянальнага руху ў Польшчы, Беларусі і Літве. На Беларусі гэты рух узначаліў К. Каліноўскі. Вядома, што Францішак Юндзіл пасля адстаўкі жыў у Гродне. Яго дом стаў прытулкам для маладых рэвалюцыянераў, каардынацыйным цэнтрам па аб'яднанні ўсіх патрыятычных сіл Айчыны. Тут яны абмяркоўвалі план паўстання.

22 студзення 1863 года ў Варшаве быў абвешчаны Маніфест аб пачатку паўстання. Яго падтрымаў Літоўскі паўстанцкі камітэт. З'явіліся першыя паўстанцкія атрады. Францішка Юндзіла прызначылі на пост ваеннага начальніка Слонімскага павета і камандзірам атрада, які фарміраваўся ў лагеры паблізу Югаліна, ва ўрочышчы Старынка. У вядомай бітве пад Мілавідамі 3 чэрвеня 1863 года асабліва вызначыўся атрад Юндзіла.

Актыўны ўдзел у гэтым паўстанні прынялі яго браты — Канстанцін ды Валер'ян. Маёнткі іх, Югалін і Асавец, былі канфіскаваны, а самі былі высланы ў горад Ядрын Казанскай губерні. Францішак Юндзіл выехаў у Францыю, дзе памёр у лютым 1865 года. (Гродзенскі дзярж. архіў, фонд 1, вопіс 22, адзінка захоўв. 1346).

**Алесь ЗАЙКА.**
**в. Заполле Івацэвіцкага раёна.**



Сядзіба Юндзілаў. Галоўны фасад.



Сядзіба Юндзілаў у Івацэвічах. Паркавы фасад.

# ПЕЙЗАЖЫСТ СТАНІСЛАЎ ЖУКОЎСКІ

## — ураджэнец Пружаншчыны

**Гісторыя кожнай краіны ведае імёны сваіх выдатных дзеячаў. Асаблівасць нашай мінуўшчыны ў тым, што людзей, якія жылі і працавалі на Беларусі, нельга дакладна аднесці да прадстаўнікоў той ці іншай гісторыі і культуры – польскай, беларускай ці рускай. Аднак відавочна адно – яны ўнеслі вялікі ўклад у сусветную культурна-гістарычную спадчыну. Адным з такіх людзей з'яўляецца ўраджэнец Пружаншчыны Станіслаў Жукоўскі.**



**Станіслаў Жукоўскі.**

Бацькі Станіслава – Юльян Жукоўскі і Марыя Вяржбіцкая – мелі спадчынную сядзібу ў Старaволі (Старой Волі). Аднак за ўдзел у паўстанні 1863 – 1864 г.г. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага Юльян Жукоўскі быў пазбаўлены шляхецтва і ўсіх сваіх уладанняў. Паводле іншых меркаванняў, інсургентам быў не бацька мастака, а яго браты, якія былі высланы з Беларусі ў Сібір на катаргу – старэйшы там загінуў, а сярэдняму ўдалося ўцячы за мяжу. Вядома, што адзін з братоў Жукоўскіх знаходзіўся ў кіраўніцтве паўстання, быў непасрэдным паплечнікам К. Каліноўскага, а другі – узначальваў шляхецка-сялянскі атрад. Таму Юльян Жукоўскі, як родзіч "небяспечных асоб", страціў маёмасць у выніку эканамічных санкцый, накладзеных царскім урадам на сем'і паўстанцаў. Праўда, і сам Юльян не быў "чысты" перад расійскай адміністрацыяй – ён пасабляў паўстанцам зброяй, коньмі, прадуктамі. Тым не менш, страта Старaволі прымусіла нашых землякоў пасяліцца на хутар Ендрыхоўцы, дзе і нарадзіўся будучы таленавіты мастак Станіслаў Жукоўскі. У сям'і пружанскіх шляхціцаў ужо быў сын Баляслаў, потым нарадзілася Марыя, пасля Станіслава з'явілася яшчэ Серафіма. Праз некаторы час Жукоўскія ўсё ж здолелі вярнуцца ў родныя мясціны, аднак не ў якасці ўладальнікаў, а толькі арандатараў. Сам Станіслаў так пісаў аб сваім дзяцінстве: "Нарадзіўся ў 1873 годзе 13 мая ў Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні ў польскай памешчыцкай сям'і, якая пражывала бязвыездна ў сваім маёнтку Старая Воля, дзе правёў я ўсё сваё дзяцінства".

Складаны і багаты жыццёвы шлях С. Жукоўскага. За 69 гадоў свайго жыцця ён стварыў 670 выдатных шэдэўраў мастацтва. Яго пейзажныя палотны зараз захоўваюцца ў цэнтральных музеях і прыватных калекцыях Беларусі (каля 30 карцін у Нацыянальным Мастацкім музеі ў Мінску), Расіі, Польшчы, Украіны і іншых краін свету. Шматлікія яго творы прысвечаны прыродзе Палесся, Белавежскай пушчы, старадаўнім сядзібам Беларусі. Яго сябрамі былі мастакі І. Рэпін, В. Сурыкаў, В. Васняцоў, М. Рэрых, В. Бялыніцкі-Біруля, спявак Ф. Шаляпін (сярод блізкіх знаёмых ён меў мянушку "польскі пан" і "Жукавіні"), а настаўнікамі – славутыя рускія жывапісцы С. Каровін, А. Архіпаў, І. Левітан, К. Савіцкі, М. Касаткін, Л. Пастарнак, В. Паленаў.

Пачатковую адукацыю Станіслаў атрымаў дома з дапамогай маці, якая сама раней вучылася ў Францыі. Далей хлопчык працягваў адукацыю ў Варшаўскай класічнай прагімназіі Лугоўскага. Пасля заканчэння Беластоцкага рэальнага вучылішча, дзе вялікі ўплыў на маладога чалавека аказаў настаўнік малявання С. Южанін, які першы заўважыў незвычайны талент Жукоўскага, ён стаў вольным наведвальнікам Маскоўскага вучылішча жывапісу, ваяння і дойлідства. Праўда, зроблена гэта было насуперак волі бацькі, які не разумеў сынавага захаплення мастацтвам, лічыў справу жывапісца ганебнай для шляхціца. Юнак з Беларусі адразу звярнуў на сябе ўвагу педагогаў і мастацкага асяроддзя свежасцю, паэтычнасцю і арыгінальнасцю сваіх пейзажаў. Жукоўскі імкнуўся паказаць у іх усю прыгажосць жыцця, непаўторнасць кожнага яе імгнення, адкрытасць сусвету. Ён заўсёды пісаў з натуры хутка і натхнённа.

Самымі першымі яго творамі былі малюнкі радавога гнязда ў Старaволі. У 1895 г. на 18-й вучнёўскай выставе, дзе было выстаўлена 13 работ Жукоўскага, увагу журы прыцягнуў яго "Памешчыцкі дом" ("Раніца"), дзе быў выяўлены родны маёнтак. Матыў сямейнага гнязда гучаў і на іншых работах майстра – "Май" (на конкурсе Таварыства вытанчаных мастацтваў у Маскве ён атрымаў першую прэмію), "Раз'езд на золку", "Бяссонная ноч. Золак", "Першыя вястункі вясны", "Падснежнікі", "Промні вясны", "Свята вясны".

Неаднойчы палотны нашага земляка адзначаліся самымі высокімі ўзнагародамі. У 1896 г. прэміямі былі адзначаны яго карціны "Восеньскай ноччу" і "Красавіцкі вечар", а ў 1898 г. – пейзаж "Вясенняя ноч", у 1901 г. – карціна "Месяцовая ноч" была адзначана вялікім сярэбраным медалём і наданнем звання класнага мастака кіраўніцтвам Маскоўскага вучылішча жывапісу, ваяння і дойлідства. За пейзаж "Плаціна" (1910 г.) Жукоўскі атрымаў ганаровую прэмію імя А. Куінджы. Некалькі яго работ набылі вядомыя рускія мецэнаты – Рабушынскі, Стрэмавухаў, Мамантаў, Трацьцякоў.

Незвычайная каларыстычная гама твораў мастака з Беларусі прыцягвала да сябе ўвагу, яе нават называлі "карнавалам Жукоўскага". Мастацкі крытык Брэшка-Брашкоўскі так ахарактарызаваў Жукоўскага: "Дзіўна таленавіты пейзажыст! Як каларыст – мацнейшы за Левітана. Вы паглядзіце на яго халодную, злёгку залацістую гаму. Цяжка бліжэй падысці да прыроды. А рэфлексы ад заходу сонца на вокнах дач? Яны дрыжаць і ззяюць, рэальныя, як элюзія. Нельга адарвацца, любуючыся, і ад свінцовай вады, якая жыве ў непагоду, зыбаецца." Ці яшчэ яго ж словы: "Жукоўскі валодае таямніцаю, якою валодалі Куінджы і Левітан. Чэхаўская манера абагульняць пейзаж, падначальваць яго настроям усяго народа. Вось млын, вада, узгорак, мужыцкія коні…Тут – уся Расія…". Яго называлі "чараўніком" і "непаўторным паэтам прыроды".



**"Май" – сядзіба роду Жукоўскіх у Старaволі.1895 – 1896 гг.**

**Наталля ПРАКАПОВІЧ.**
**г. Пружаны.**

*(Працяг на стар. 12)*

# БЕРАСЦЕЙЦЫ

**У Берасці выдалі камплект з дзесяці паштовак, на якім — вядомыя дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі, якія нарадзіліся або маюць дачыненне да Берасцейшчыны. На адваротным баку паштовак змешчаная кароткая гістарычная даведка аб кожным з дзеячоў. Прыводзім тут тэкст аб дзеячах, адлюстраваных на паштоўках.**

**Станіслаў Булак-Балаховіч**
**10.02.1883 - 10.05.1940**

Нарадзіўся на Браслаўшчыне ў сям'і беларусаў-каталікоў са збяднелай шляхты. У бацькоў было 9 дзяцей. Скончыў сярэднюю сельска-гаспадарчую школу, стаў аграномам.

Падчас падзеяў рэвалюцыі 1905 г. Станіслаў Балаховіч абараняў сялянаў, за што яго з тых часоў пачалі называць "Бацькам". Перад вайной належыў да партыі расійскіх сацыял-рэвалюцыянераў.

20.08.1914 г. у чыне харунжага пайшоў добраахвотнікам у расійскую армію. З лютага 1918 г. С. Балаховіч у Чырвонай арміі, прычым Троцкі асабіста даручыў яму фармаванне петраградскага кавалерыйскага партызанскага палка. Убачыўшы сапраўднае стаўленне Саветаў да сялянаў, 7.11.1918 г. Балаховіч перайшоў са сваім палком у шэрагі перакана领ных праціўнікаў бальшавікоў.

У 1918-19 гг. Балаховіч стаў адным з герояў абароны незалежнасці Эстоніі ад бальшавікоў, за што атрымаў чын падпалкоўніка. У арміі Юдзеніча ен даслужыўся да чыну генерал-маёра і асабліва адзначыўся пры ўзяцці Пскова.

14.11.1919 г. Балаховіч падаў ва ўрад БНР заяву аб беларускім грамадзянстве і просьбу прыняць яго на беларускую службу разам з яго Асобым атрадам. 26.02.1920 г. рашэннем Пілсудскага атрад Балаховіча быў прыняты пад польскае камандаванне і 5 сакавіка з Дзвінску быў накіраваны ў Берасце дзеля рэарганізацыі і папаўнення свайго складу перад адпраўкай на фронт. У Берасці Асобы атрад ген. С. Булак-Балаховіча (каля 700 чалавек) размяшчаўся ў "чырвоных казармах" непадалёку ад форту Бэрг.

Падчас польска-бальшавіцкай вайны 16.08.1920 г. балахоўцы разбілі армію Будзённага і цалкам спынілі бальшавіцкі наступ. 17.08-07.09.1920 г. група Балаховіча знаходзілася ва Уладаве і яе ваколіцах, дзе паспяхова трымала абарону ад бальшавікоў, а потым і перайшла ў наступ. Рэйд групы ген. Балаховіча па Палессі быў настолькі паспяховы, што 16.09.1920 г. яго аддзелы дзейнічалі ўжо ў раёне Пінска. Аперацыя па захопу самога Пінска 27.09.1920 г. сталася адной з самых удалых вайсковых аперацыяў групы ген. Балаховіча за час ваенных дзеянняў на бальшавіцкім фронце.

Сканцэнтраваўшы вайсковыя сілы ў раёне Лунінец-Мікашэвічы, восенню 1920 года ген. Балаховіч на чале 10-тысячнай саюзнай арміі здзейсніў вайсковы паход на акупаваную бальшавікамі Беларусь. 7.11.1920 г. у Тураве пад беларускім сцягам ен склаў прысягу аб змаганні за Беларусь да яе поўнага вызвалення ад бальшавікоў. 12.11.1920 г. у Мазыры ген. С. Булак-Балаховіч нанова ўрачыста абвясціў незалежнасць Беларусі, прыняў тытул Начальніка ўзброеных сілаў Дзяржавы і прызначыў новы ўрад БНР.

У міжваенны перыяд падтрымліваў сувязь са сваімі былымі жаўнерамі, пра лёс якіх увесь час клапаціўся. Неадназова на яго рабіліся замахі, а 13.06.1923 г. камуністамі быў забіты яго родны брат і паплечнік Язэп, які таксама быў генералам. Наогул, значная частка яго радзіны загінула ад рук бальшавікоў, у тым ліку і маці, якая памерла пасля допытаў у ЧК у 1919 г.

С. Булак-Балаховіч вядомы таксама як аўтар літаратурных і публіцыстычных твораў, напісаных па-польску і па-беларуску. Адна з яго кніжак па-беларуску выйшла ў 1928 г. у Берасці.

10.05.1940 г. генерал С. Булак-Балаховіч загінуў у Варшаве ад рук гестапа.

У памяць пра ген. С. Балаховіча і яго жаўнераў у Берасці на "Балахоўскіх могілках" (мікрараён Рэчыца) у 2002 г. усталяваныя дзве мемарыяльныя пліты.

**Аляксандр Цьвікевіч**
**22.04.1888 - 30.12.1937**

Нарадзіўся ў Берасці ў сям'і чыгуначнага фельчара Івана Цьвікевіча, які жыў пры чыгуначнай бальніцы. Меў малодшага брата Івана (1891 г.), які стаў медыкам і яго паплечнікам. Разам з братам вучыўся ў берасцейскай гімназіі (цяпер у гэтым будынку адзін з карпусоў БрДУ імя А. Пушкіна). Атрымаў выдатную адукацыю на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта.

З 1912 г. працаваў прысяжным павераным у Берасці і Пружанах. У часы 1-й Сусветнай вайны жыў у Туле, Маскве. Працуючы з 1916 г. у складзе Камітэта помачы ахвярам вайны, шмат дапамагаў беларускім бежанцам. У 1917 г. стаў адным з заснавальнікаў у Маскве Беларускай народнай грамады.

Быў сярод актыўных удзельнікаў 1-га Усебеларускага З'езда ў снежні 1917 г. Дзякуючы намаганням А. Цьвікевіча, удалося прымірыць розныя групы на з'ездзе і не дапусціць расколу. З 1918 г. - адзін з лідэраў Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў. У 1918 г. быў на мірных перамовах у Берасці ў якасці дарадцы дэлегацыі УНР па беларускіх справах.

Ад моманту абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. займаў адказныя пасады ва ўрадзе БНР і выконваў самыя важныя яго даручэнні. Узначальваў дыпламатычную місію БНР ва Украіне, дзе заснаваў Беларускую гандлёвую палату, выдаваў у Кіеве штотыднёвік "Белорусское эхо". З вясны 1919 г. узначальваў Надзвычайную дыпламатычную місію БНР у Берліне, дзе для азнаямлення заходніх палітычных колаў з беларускай праблематыкай выдаў палітычны нарыс "Беларусь". Быў міністрам юстыцыі ва ўрадзе А. Луцкевіча і міністрам замежных спраў БНР ва ўрадзе В. Ластоўскага, а з 1923 г. узначальваў урад БНР у эміграцыі. Жыў у Коўне і Празе. У 1922 г. бараніў інтарэсы Беларусі на Генуэзскай канферэнцыі.

У канцы 1925 г. А. Цьвікевіч склаў паўнамоцтвы прэм'ер-міністра БНР і прыехаў у Менск для нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Працаваў кансультантам у Наркамаце фінансаў, а з вясны 1926 г. - вучоным сакратаром Інбелкульту (пазней—Беларуская Акадэмія навук) і па сумяшчальніцтве у Чырвоным Крыжы, дзе быў намеснікам старшыні. З восені 1927 г. - навуковы супрацоўнік у Інстытуце гісторыі.

Аляксандр Цьвікевіч - аўтар шматлікіх публікацыяў і шэрагу навуковых прац, у якіх ён прапагандаваў ідэю беларускай дзяржаўнасці, бараніў інтарэсы краіны і яе незалежнасць ад прэтэнзіяў краінаў-суседзяў.

Яго самая значная і дагэтуль выключна актуальная навуковая праца -"Западноруссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.". Адразу пасля таго, як кніга была надрукавана ў 1929 г., увесь наклад яе быў канфіскаваны і знішчаны.

14 ліпеня 1930 г. А. Цьвікевіч арыштаваны па сфабрыкаванай справе "Саюза вызвалення Беларусі" і сасланы разам з сям'ёй на 5 гадоў (пазней тэрмін працягнулі яшчэ на 2 гады) у Сібір (жыў у Пярмі, Ішыме, Сарапуле). 17 снежня 1937 г. быў паўторна арыштаваны, дастаўлены ў Менск і 30 снежня 1937 г. расстраляны.

Па справе СВБ Аляксандр Цьвікевіч быў рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 10.06.1988, а 31.05.1989 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР цалкам рэабілітаваў яго.

**Іван Цьвікевіч**
**?.11.1891 - 01.08.1931**

Нарадзіўся ў Берасці ў сям'і фельчара Івана Цьвікевіча, які працаваў у чыгуначнай лякарні. Меў старэйшага брата Аляксандра Цьвікевіча, які стаў прэм'ер-міністрам БНР і якому быў паплечнікам. Як і брат, вучыўся ў мужчынскай гімназіі ў Берасці. У 1914 г. скончыў медычны факультэт Варшаўскага універсітэта.

Жывучы ў Маскве, доктар Іван Цьвікевіч разам з братам А. Цьвікевічам быў сярод кіраўнікоў мясцовай арганізацыі Беларускай сацыялістычнай грамады, актыўна працаваў у складзе Цэнтральнага беларускага бежанскага камітэта, які аб'ядноўваў беларускіх уцекачоў, што жылі ў розных кутках Расеі. Спрычыніўся да стварэння ў Маскве Беларускай народнай грамады.

У 1917-1921 гг. мабілізаваны ў Чырвоную Армію, дзе служыў дывізіённым лекарам. У 1920 годзе дывізія, у якой ён служыў, была інтэрнавана ў Германіі. У 1921 - 1923 гг. працаваў у Берліне ў савецкім пасольстве ў Германіі, падтрымліваў кантакты з дзеячамі БНР. У 1924 г. пераехаў у Менск. З'яўляўся членам калегіі Наркамата аховы здароўя БССР, працаваў загадчыкам аддзела ў Белдзяржвыдавецтве.

Доктар Іван Цьвікевіч быў сярод тых, хто першым узяўся распрацоўваць беларускую медычную тэрміналогію. Разам з вядомымі дзеячамі БНР В. Ластоўскім і К. Дуж-Душэўскім Іван Цьвікевіч у 1923 годзе падрыхтаваў першы беларускамоўны падручнік у галіне медычных ведаў - "Фізыолегія і анатомія

# — ДЗЕЯЧЫ БНР

чалавека" (перакладзены ім з расейскай), які прызначаўся для школ і які быў выдадзены Бюро па ўкладанні і перакладах падручнікаў на беларускую мову пры Народным Сакратарыяце Асветы БНР.

З 1924 г. ён узначальваў Медычную калегію Інбелкульту (з 1928 г. - у складзе Інстытуту навуковай мовы Беларускай Акадэміі навук) і Тэрміналагічную камісію пры ёй. Плёнам працы камісіі пад яго кіраўніцтвам стала праца, выдадзеная ў 1926-1929 гг.,- "Nomina Anatomica Alborutenica - Анатамічныя назвы" (у 3-х тамах). Была распачата таксама праца над фізіялагічнай і інфекцыйнай тэрміналогіямі, але яна не была скончана і засталася ў рукапісах.

Іван Цьвікевіч - аўтар гістарычнага нарысу "Канстантын Каліноўскі", які быў надрукаваны пад псеўданімам Іван Трызна ў часопісе ўраду БНР "Беларускі сьцяг" у 1922 г. Гэта была адна з першых прац пра кіраўніка паўстання 1863 г. у Беларусі, у якой абгрунтоўвалася думка пра К. Каліноўскага як свядомага змагара за незалежнасць беларускага народа. Іван Цьвікевіч займаўся таксама перакладамі мастацкіх твораў на беларускую мову (Рабіндранат Тагор і інш.).

У канцы 1929 г. падчас "чысткі" кіруючых органаў БССР ад нацдэмаў не пабаяўся на адкрытым сходзе ў Наркамаце асветы выступіць у абарону першага старшыні ўраду БССР, беларускага пісьменніка Зьмітра Жылуновіча. Гэтая мужная пазіцыя была кваліфікаваная сталіністамі як "чарговая вылазка беларускага нацыянал-дэмакратызму" і ў хуткім часе адгукнулася рэпрэсіямі супраць яго самога.

Доктар Іван Цьвікевіч быў арыштаваны 18 ліпеня 1930 года па сфабрыкаванай справе "Саюза вызвалення Беларусі". Асуджаны 10 красавіка 1931 года на 5 гадоў лагераў. Пакаранне адбываў у Нарыме, з'яўляўся начальнікам санчасці Нарымлага. Затым пасяліўся ў г. Усьць-Канск Алтайскага краю, дзе працаваў лекарам у раённай бальніцы. Паўторна арыштаваны 05 мая 1938 года. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 1 жніўня 1938 г. прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР 19 верасня 1960 года.

**Адам Трыпус**
**? - 16.09.1965**

Вядомы таксама пад прозвішчамі і псеўданімамі Трыпуза, Трыпус-Траянаў, Каласкоў.

Паходзіць з Вялікай Бераставіцы на Гарадзеншчыне.

У часы змагання за незалежнасць у 1920-я гады быў павятовым камендантам Гарадзенскага павета і сябрам Гарадзенскага акруговага штабу антыпольскага партызанскага руху, арганізаванага ўрадам БНР В. Ластоўскага.

У 1920-21 гг. - настаўнік Віленскага беларускага прытулку. На пачатку 1921 г. арыштоўваўся польскімі ўладамі.

Быў сярод заснавальнікаў Гарадзенскага аддзялення Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны. З 1921 г. працаваў настаўнікам Гарадзенскай беларускай гімназіі, а таксама быў адным з кіраўнікоў беларускага прытулку для дзяцей у Горадні.

Вылучаўся ад блоку нацыянальных меншасцяў, у які ўваходзілі беларусы, на выбарах у польскі сейм па акрузе ў Беластоку.

У 1923 годзе абвінавачваўся польскімі ўладамі ў антыдзяржаўнай дзейнасці і праходзіў у судовым працэсе ў Беластоку па "справе 45-ці" (супраць беларускіх актывістаў).

З другой паловы 1920-х гг. жыў у Берасці, працаваў настаўнікам у в. Ратайчыцы. Пасля вайны працаваў у Берасцейскім раенным аддзеле адукацыі і ў педагагічным інстытуце.

Трагічна загінуў у выніку збіцця невядомымі пры нявысветленых абставінах. Пахаваны на Трышынскіх могілках у Берасці.

Заўсёды ганарыўся, што паходзіць з радзімы К. Каліноўскага. Праз усё жыццё захоўваў знак Пагоні часоў змагання за незалежнасць Беларусі.

**Раман Скірмунт**
**25.04.1868 - 07.10.1939**

Нарадзіўся ў м. Парэчча Пінскага павету. Паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду. Быў адным з васьмі дзяцей у сям'і вядомых на Палессі землеўласнікаў.

Сваю грамадскую дзейнасць Р. Скірмунт распачаў з пасады старшыні Таварыства па распрацоўцы сельскагаспадарчых і эканамічных патрэбаў Палесся. Быў адным з распрацоўшчыкаў праграмы Краёвай партыі Літвы і Беларусі, якая грунтавалася на традыцыях ВКЛ. У 1906 г. абраны дэпутатам 1-й Дзяржаўнай думы Расеі ад Менскай губерні, а ў кастрычніку 1910 г. - членам Дзяржаўнай Рады. Заўсёды адстойваў інтарэсы свайго роднага краю, выступаў за дэцэнтралізацыю кіравання, адмену саслоўных прывілеяў і скасаванне ўсіх нацыянальна-рэлігійных абмежаванняў.

У жніўні 1914 г. Менскае земства выбрала Р. Скірмунта на адказныя пасады ва Усерасейскі земскі саюз дапамогі хворым і параненым воінам. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Р. Скірмунт становіцца адной са знакавых постацяў маладой беларускай палітыкі. У студзені 1917 г. ён абраны старшынёй Менскага аддзелу Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны - адзінай дазволенай уладамі беларускай арганізацыі ў Менску, якая праз нейкі час стала часовым Беларускім камітэтам. Р. Скірмунт быў сярод ініцыятараў правядзення ў Менску З'езда нацыянальных арганізацыяў 25-27 сакавіка 1917 г., які ўпершыню сабраў разам самыя розныя палітычныя сілы і распрацаваў праграму аўтаноміі Беларусі. Для яе рэалізацыі З'езд сфармаваў Беларускі нацыянальны камітэт, які ўзначаліў Р. Скірмунт.

Каб вытрымаць цяжар нямецкай акупацыі Беларусі і бараніць інтарэсы краю, 25 лютага 1918 г. ён стварыў Беларускае (Менскае) народнае прадстаўніцтва. 12 красавіка 1918 г. Р. Скірмунт быў уведзены ў склад Рады БНР. 14 траўня 1918 г. Рада даручыла яму ўзначальваць Народны сакратарыят БНР і сфармаваць урад. На пасадзе прэм'ер-міністра ён быў да канца ліпеня 1918 г.

У міжваенны час жыў і гаспадарыў у родавым маёнтку ў Парэччы, з'яўляўся сенатарам, выступаў супраць асіміляцыі нацыянальных меншасцяў у Польшчы. Быў шчодрым чалавекам, простым і даступным у стасунках. Дапамагаў сялянам і клапаціўся пра іх асвету, а ў другой палове 1930-х пачаў раздаваць зямлю як падарунак маладым на вяселле.

Раман Скірмунт трагічна загінуў 7 кастрычніка 1939 г. ва ўзросце 72 гадоў: на загад савецкіх камісараў ён быў расстраляны разам са сваякамі ў лесе каля Парэчча. Яго цела перазахавана падчас вайны на ўскрайку парэцкага парку. У савецкія часы магіла была знішчана, адноўлена на пачатку 1990-х.

А ў Парэччы яшчэ захаваўся парк, закладзены самім Р. Скірмунтам.

*(Працяг будзе.)*

**Ігар БАРАНОЎСКІ.**
**г. Берасце**


С. Булак-Балаховіч


А. Цвікевіч


І. Цвікевіч


А. Трыпус


Р. Скірмунт

# ПЕЙЗАЖЫСТ СТАНІСЛАЎ ЖУКОЎСКІ

## — ураджэнец Пружаншчыны

*(Працяг. Пачатак на стар. 9)*

У 1897 г. адбыліся змены ў асабістым жыцці пейзажыста – ён аформіў шлюб з мастачкай Аляксандрай Ігнацьевай, постаць якой адлюстравана на палотнах “Бяссонная ноч”, “Апошні акорд”, “Журботныя думкі”.

Сярод яго вядомых работ таксама – “Вясной у лесе”, “Белы дом”, “Вялікая дарога”, “У сядзібе”, “Вясенняя вада”, “Пейзаж з ракой”, “Возера Сенеж”.

Шмат карцін Жукоўскі прысвяціў сядзібнаму інтэр’еру. Асноўную ролю ў такіх яго творах ігралі вокны, якія заўсёды былі адчынены свету, чырвоны колер і фіялкі (“Інтэр’ер”, “Радасны май”, “Веснавыя прамяні”, “Гасцёўня з раялем”). Адлюстраванне інтэр’ераў стала адкрыццём С.Жукоўскага.

З 1903 г. Станіслаў стаў пастаянным удзельнікам Таварыства перасоўных выставаў (“передвижников”). Каля 1906 г. ён адкрыў уласную школу жывапісу, дзе навучаўся ў тым ліку будучы паэт і графік-плакатыст У. Маякоўскі. А ў 1907 г. нашаму суайчынніку было прысвоена званне акадэміка жывапісу, ён увайшоў у склад Саюза рускіх мастакоў.

Мастак працягваў працу ў час і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., якую сустрэў даволі стрымана. Трэба адзначыць, што Станіслаў не любіў розныя палітычныя і мастацкія дыскусіі. Сваю дзейнасць у гэты складаны час ён засяродзіў на захаванні помнікаў мінулага. Жукоўскі быў абраны членам калегіі мастакоў пры Траццякоўскай галерэі. Як упаўнаважаны пры Савеце Народных Камісараў (савецкім урадзе), Станіслаў Юльянавіч разам з іншымі вядомымі асобамі мастацкай супольнасці ўратаваў шэраг сядзіб ад знішчэння, калі выступіў ініцыятарам стварэння ў панскіх маёнтках музеяў.

Аднак жыццё не заўсёды было спрыяльным для нашага суайчынніка. У 1921 г. у Маскве адбылася яго персанальная выстава. Але папулярныя ў той час рэвалюцыйныя мастакі-авангардысты абрушыліся на С. Жукоўскага з нападкамі, што вельмі абразіла майстра. Асаблівы боль прычынілі прызнанаму жывапісцу, калі не запрасілі да ўдзелу ў выставах “перадзвіжнікаў” і Саюза мастакоў у 1923 г..



Карціна Жукоўскага “Інтэр’ер”.

У 1923 г. Жукоўскі разам з другой жонкай і вучаніцай Соф’яй Кваснецкай (адлюстравана на карціне “Перад маскарадам”) пераехаў у Польшчу, дзе працягваў пісаць. А. Ігнацьева, з якой Станіслаў развёўся, захавала з ім добрыя сяброўскія адносіны на ўсё жыццё, неаднойчы дапамагала яму ў цяжкія часіны.

У Варшаве славуты мастак адкрыў прыватную школу жывапісу, якая карысталася вялікай папулярнасцю і лічылася вельмі прэстыжнай. Не адзін раз наведваў ён сваю малую радзіму, гасцяваў у розных шляхецкіх сядзібах Гарадзенска-Берасцейскага краю. Да “польскага” перыяду творчасці адносяцца такія яго работы, як “Ручай”, “Лета ў Варшаве”, “Восеньская раніца”, “Іней”, “Лунная ноч”, “Язмін і півоніі”. Аднак на большасці яго пейзажных палотнаў адлюстравана прырода Беларусі. Пацвярджае гэта “Tygodnik illustrowany” (№8, 36 за 1923 г.), дзе дадзены такія ацэнкі творчасці: “яго ... матывы, якія ён чэрпаў з Літвы і Беларусі, нясуць на сабе адбітак праўды ...”, ён “бачыць у прыродзе крыніцу найвышэйшага натхнення”, а таксама – “з вяртаннем Жукоўскага на Бацькаўшчыну (польскае мастацтва) здабыло працаўніка з надзвычайнымі і салпіднымі якасцямі”. Гэты час спрыяў новаму росквіту яго таленту. Ён безупынна працаваў, выстаўляў свае работы ў Осла, Капенгагене, Парыжы, Кракаве, Мюнхене, Рыме, Таронта, Нью-Йорку, Лос-Анджэлесе, карыстаўся вялізарным аўтарытэтам і павагай сусветнай мастацкай грамадскасці. Яркімі падзеямі ў жыцці даваеннай Польшчы былі яго шматлікія персанальныя выставы.

Лёс Станіслава Жукоўскага склаўся трагічна. У час Другой сусветнай вайны ён знаходзіўся ў Варшаве, дзе меў сувязі з польскім падполлем. Напярэдадні ўваходу ў сталіцу Польшчы Чырвонай Арміі мясцовыя патрыёты-антыфашысты ўзнялі паўстанне, але яно было жорстка пакарана нямецкімі войскамі. Станіслаў Жукоўскі, як удзельнік гэтых падзей, быў арыштаваны і загінуў восенню 1944 г. у Прушкоўскім лагеры смерці. Разам з іншымі ахвярамі фашызму ён быў пахаваны ў брацкай магіле. Творы мастака, што знаходзіліся ў горадзе, загінулі ў пажары.

Багатае жыццё і мастацкая спадчына Станіслава Жукоўскага, ураджэнца Пружаншчыны, – гэта важная старонка нашага мінулага, якое адкрываецца нам усё з новых бакоў, трэба толькі глыбей зазірнуць у яго скарбонку.



Карціна Жукоўскага “Стары маёнтак”.

**Наталля ПРАКАПОВІЧ.**
**г. Пружаны.**

# ПРАТЭСТАНТЫЗМ НА ТЭРЫТОРЫІ СТОЛІНСКАГА ПАВЕТА Ў 1920—1930-я гг.

**Століншчына на працягу стагоддзяў з'яўлялася рэгіёнам, дзе традыцыйна распаўсюджвалася хрысціянства ўсходняга абраду. Рэфармацыя XVI стагоддзя нязначна закранула гэтыя землі, таму прадстаўнікоў пратэстанцкіх цэркваў сярод мясцовых людзей не было.**

Пасля ўваходжання ў склад II Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Століншчыны актыўна сталі распаўсюджвацца розныя пратэстанцкія накірункі хрысціянства. Пратэстантызм адрозніваўся сваім распаўсюджваннем на Століншчыне тым, што большасць пратэстантаў на гэтай тэрыторыі першапачаткова былі праваслаўнымі. Тут узніклі такія цэрквы, як Евангельскія хрысціяне-баптысты, Евангельскія хрысціяне царквы Божай, Евангельскія хрысціяне-пяцідзесятнікі, Адвентысты сёмага дня.

Пратэстантызм прыйшоў на Століншчыну з тэрыторыі Заходняй Украіны. У час знаходжання часткі зямель Заходняй Украіны ў складзе Аўстра-Венгрыі тут з'явілася вялікая колькасць немцаў-каланістаў, якія прынеслі з сабою і распаўсюджвалі розныя пратэстанцкія накірункі хрысціянства. І ў хуткім часе на тэрыторыі Заходняй Украіны з'явілася вялікая колькасць пратэстанцкіх абшчын.

Пасля падпісання Рыжскага міру землі Заходняй Беларусі і Украіны знаходзіліся ў складзе Польшчы, і ў выніку міграцыйных працэсаў пратэстанты з'явіліся на тэрыторыі Столінскага павета. Гэта былі выхадцы з заходнеукраінскіх зямель, а таксама жыхары Століншчыны, якія ездзілі на заробкі на Украіну і прынялі там хрышчэнне.

Адной з першых на тэрыторыі павета ўзніклі абшчыны царквы Евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Баптысты з'явіліся на тэрыторыі Столінскага павета ў 1922 годзе. Актыўным дзеячам баптыстаў быў Мікіта Вандзіч. Пад яго кіраўніцтвам былі закладзеныя першыя абшчыны баптыстаў у Столінскім павеце.

У 1922 годзе з'явіліся першыя абшчыны ў вёсках Манькавічы, Струга і Дубянец. Колькасць вернікаў у 1922 годзе ў Манькавічах была—39, Струзе — 14, Дубянцы — 6 чалавек.

Да канца 1920-х колькасць вернікаў у гэтых абшчынах павялічылася, з'явіліся новыя абшчыны.Так, ужо ў 1929 годзе ў Манькавічах пражывала 90 баптыстаў, у Струзе—57, Вікаравічах—19, Крушыне—12, Хотамелі—9, Варанях—14, Дубянцы—37, Магільным—4, Рублі—24. У 1924 годзе на тэрыторыі павета баптысты мелі два малітоўныя дамы: у Струзе і Манькавічах, а ў Дубянцы быў куплены дом, у якім вернікі збіраліся на малітву. У Варшаве на вул. Паўлоўскай, 34 знаходзілася цэнтральная сядзіба хрысціян-баптыстаў. Узначальваў яе пастар Баляслаў Гётцэ. Яму падпарадкоўваліся і баптысты Століншчыны.

У 1923 годзе на тэрыторыі Столінскага павета ўзніклі абшчыны Евангельскіх хрысціян-пяцідзесятнікаў. Выбітнымі прадстаўнікамі дадзенага накірунку на тэрыторыі Столінскага павета былі Пётр Савіч і Фёдар Максімовіч. Яны заклалі аснову будучых абшчын пяцідзесятнікаў на тэрыторыі павета.

У 1923 годзе Пётр Савіч заклаў абшчыну пяцідзесятнікаў у вёсцы Жардзец, якая першапачаткова налічвала 8 чалавек, у 1929 г. колькасць яе ўзрасла да 43 чалавек. Пяцідзесятнікі з'явіліся ў 1923 г.: у Будымлі—6 чалавек (1929 г.—26), на хут. Каменны Востраў—2 чалавекі (1929 г.—20), у 1927 г.: ў Белай Грыніцы—3 (1929 г.—10), у 1927 г.: ў Рэчыцы—2 (1929 г.—11).

Фёдар Максімовіч заклаў абшчыну пяцідзесятнікаў у Альшанах. У 1923 г. яна налічвала 11 чалавек (1929 г.—57 чал.). Пяцідзесятнікі ў 1923 г. з'явіліся ў Харомску—8 чал. (1929 г.—54); у Малешаве—1 чал. (1929 г.—20); у 1927 г.—у Сямігосцічах—2 чал. (1929 г.—11 чал.).

У канцы 1920-х гг. пяцідзесятнікі на Століншчыне купілі два дамы (у Альшанах і Жадцы), якія прыстасавалі пад дамы малітвы. Дадзеная плынь пратэстантызму з'яўлялася даволі маладой па свайму складу. Так, напрыклад, у Альшанах сярэдні ўзрост сярод пяцідзесятнікаў складаў у пач. 1930-х гг. ад 25 да 35 гадоў.

У 1923 г. на тэрыторыі павета ўзнікла абшчына Евангельскіх хрысціянаў царквы Божай на Мерлінскіх хутарах. У 1923 г. колькасць вернікаў дадзенай абшчыны складала 14 чал., у 1929 г. іх колькасць павялічылася да 36. Кіраўніком дадзенай абшчыны і яе заснавальнікам быў выхадзец з Заходняй Украіны Фёдар Украінец. Галоўная сядзіба царквы Божай знаходзілася ў калоніі Амелін (Ровенскі павет). Кіраўнікамі яе з'яўляліся выхадцы з Нямеччыны Густаў Нінкель і Густаў Бітнэр. Дарэчы, абшчына царквы Божай на Мерлінскіх хутарах была адной з нямногіх на тэрыторыі Зах. Беларусі. У 1920-х гг. на Мерлінскіх хутарах абшчына купіла хату і пераабсталявала яе пад дом малітвы. У 1930-х гг. на Мерлінскіх хутарах узнікла уніяцкая парафія і да канца 1930-х гг. большасць вернікаў царквы Божай перайшла ва уніяцтва ці ў праваслаўе, а сама абшчына знікла.

Адной з першых на тэрыторыі Столінскага павета і тэрыторыі сучаснай Беларусі ўзнікла абшчына Адвентыстаў сёмага дня ў Фядорах. Заснаваў яе Іоў Карычко ў 1926 г. У Фядорах яны зрабілі дом малітвы ў 1930 г. Адвентысты з Фядор мелі зносіны з цэнтральнай сядзібай адвентыстаў у Варшаве, якую ўзначальваў Тэадор Вілле.

У 1926 г. у Фядорах, Калодным, Нечатаве і Радчыцку пражывала 55 адвентыстаў. Да 1929 г. іх колькасць узрасла да 90 чалавек.

Такім чынам, калі ў 1921 г. на тэрыторыі павета былі лічаныя адзінкі пратэстантаў розных накірункаў, то ў 1922 г. іх колькасць узрасла да 59 чалавек, а ў 1929 г. налічвалася 649 чалавек—павялічылася ў 11 разоў.

Якія ж фактары спрыялі такому хуткаму росту пратэстантызму на Століншчыне?

Цэнтрамі пратэстантызму ў павеце станавіліся вёскі, дзе рэлігійная пропаведзь, якую вяла праваслаўная царква, была менш актыўнай па розных прычынах. Слабасць праваслаўных пазіцый тлумачылася:

- недахопам святароў;
- непадрыхтаванасцю многіх святароў да высокакваліфікаванага выканання сваіх абавязкаў;
- аддалёнасцю некаторых частак прваслаўных прыходаў ад цэнтра, як гэта было на Мерлінскіх хутарах і інш.

Адносіны мясцовага праваслаўнага насельніцтва да новааб'яўленых пратэстантаў былі розныя. Адна частка талерантна адносілася да іх, іншыя ставіліся да пратэстантаў нецярпіма.

Так, даволі часта многія мясцовыя жыхары пісалі даносы на сваіх аднавяскоўцаў-пратэстантаў, якія збіраліся на малітву. Негатыўнае стаўленне было да пратэстантаў і з боку праваслаўнага духавенства. Так, у 1933 г. у В. Бараноўскага з хутара Загор'е, які стаў баптыстам, памерла дачка. Ён хацеў пахаваць яе на могілках у в. Дубай, але праваслаўны святар з Дубая забараніў яму гэта зрабіць. В. Бараноўскаму прыйшлося звяртацца ў старастваСтоліна, каб там вырашылі яго справу.

Не вельмі талерантна адносіліся да пратэстантаў мясцовыя польскія ўлады. За кожным рухам пратэстанцкіх пастараў і прэсвітэраў пільна сачыла паліцыя, а кожны збор на супольную малітву простых вернікаў без дазволу на тое ўлад забараняўся і караўся. Напрыклад, у 1938 г. у в. Хотамель па даносе аднаго з жыхароў гэтай вёскі паліцыя аштрафавала Адама Ніконччыка за тое, што ён без дазволу правёў супольную малітву мясцовых баптыстаў у сваім доме.

Трэба адзначыць, што разам з гэтымі пратэстанцкімі накірункамі на тэрыторыю павета трапляюць і іншыя ідэі. Гэта звязана з імем Ілы Ляшкевіча. Ён нарадзіўся ў в. Альпень ў сялян-скай сям'і ў 1897 г., служыў у расійскім царскім войску. Ад нараджэння І. Ляшкевіч быў правас-лаўным, а ў 1925 г. стаў баптыстам. У 1935 г. паехаў на Валынь з мэтай распаўсюджвання баптызму сярод мясцовага насельніцтва. Там змяніў свае погляды і вярнуўся ў праваслаўе. Пасля пайшоў у праваслаўны манастыр у Пачаеве. Восенню 1938 г. вярнуўся ў Альпень, дзе пачаў прапаведаваць, называючы сябе Св. Іллёй альбо Св. Апосталам. Хадзіў па суседніх вёсках, спяваючы песні і чытаючы малітвы на рускай мове. Мясцовыя жыхары лічылі яго не зусім здаровым і ўвагі на яго не звярталі. На некаторы час ім зацікавілася паліцыя і ўстана-віла за ім нагляд, але са шматлікіх данясенняў і пратаколаў было вырашана, што Ілья Ляшкевіч нездаровы псіхічна, а хвароба ягоная ўзнікла з прычыны празмернага захаплення рэлігіяй.

З'яўленне пратэстантызму на тэрыторыі Столінскага павета ў 1920-1930 гг. не здолела радыкальна паўплываць на канфесійную сітуацыю ў гэты час. У гэты перыяд была закладзена аснова пратэстанцкіх абшчын на Століншчыне, многія з іх пасля Другой сусветнай вайны зніклі, але найбольш буйныя абшчыны захаваліся. У сёння-шні час большасць тых пратэстанцкіх абшчын адноўлена, а Століншчына з'яўляецца адным з цэнтраў пратэстантызму ў Беларусі.

**Аляксандр КАРПОВІЧ.**
**Столінскі раён.**

# ПРАЎДА І КРЫЎДА ПАМЯЦІ:

**Дакладных, праўдзівых і поўных звестак пра абедзве трагедыі, перажытыя маімі аднавяскоўцамі ад фашысцкіх карнікаў і паліцаяў улетку 1941 года і ад савецкіх партызанаў увосень 1942-га, няма ні ў энцыклапедычных даведніках, ні ў гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць. Ганцавіцкі раён». Пра мірных жыхароў, закатаваных здраднікамі і акупантамі роўна праз месяц пасля пачатку вайны, чытаю як пра герояў, што «загінулі ў барацьбе з фашызмам». Пра знішчэнне вёскі партызанскім агнём і гібель людзей ад партызанскіх куляў напісана з яшчэ большым змяшчэннем акцэнтаў: «...нямецка-фашысцкія захопнікі часткова спалілі вёску». Гэтак напісана ў БелСЭ, выдадзенай больш чым трыццаць гадоў назад. Новая ж Беларуская энцыклапедыя, ужо без азначэння «савецкая», апошні том якой выйшаў летась, абодва факты, няхай і скрыўленыя, замоўчвае наогул, затое, як і хроніка «Памяць», усяляк услаўляе Чудзінскі бой... І толькі памяць старэйшых жыхароў, чые балючыя ўспаміны я збіраў не адзін год, дазваляюць мне зняць ідэалагічны полаг з дзвюх праўдзівых трагедый вёскі Чудзін.**

**Трагедыя першая:**
**1941 год, 22 ліпеня**

Дарога смутку за новымі чудзінскімі могліцамі, адкрытымі на палявым узгорку, вядзе ў больш далёкую мінуўшчыну — у лес, за балота, дзе адгаліноўвае шырокую прасеку з Курганом памяці ў канцы. Тут — галгофа першых ахвяраў вайны. Зрэшты, галгофа пачалася яшчэ перад лесам, на раздарожжы, дзе паліцаі і нямецкія вайскоўцы зрабілі апошнюю «паверку» абезнадзееных нявольнікаў, а потым загадалі піхаць грузавік вярсты дзве па грузкіх пясчаных каляінах. Што ж, так было заўсёды: асуджаны на смерць свой пакутніцкі крыж нёс сам. І сам, як у гэтым выпадку, капаў яму для сябе. Над ямаю, часовaю магілаю закатаваных, з гадамі і паўстаў Курган памяці.

Цяпер ён зусім прыземісты, заімшэлы, а я памятаю, калі і як насыпаўся: у 1965-м вялікай і згуртаванай талакою, у падобных да якой мне больш не даводзілася ўдзельнічаць. Камуністычныя і камсамольскія суботнікі — ні ў якое параўнанне! Гэта была праца руплівага мурашніка; нават дашкольнік цягнуўся кінуць хоць жменю пяску.

Я, тады сямікласнік, працаваў поруч з бацькам, адным з былых партызанаў і франтавікоў, што ўзялі на сябе ролю брыгадзіраў і прарабаў. Шчыраваў ён па-асабліваму — з суровай зацятасцю, з непрытворнай тугою. Мне толькі ўяўлялася, а ён, мусіць, зноў яскрава бачыў знявечанае цела свайго бацькі, майго дзеда. Ці не пагэтаму я не асмеліўся спытацца ў яго, хоць і карцела: а чаму ж так позна, ажно праз дваццаць пяць з лішкам гадоў, ушаноўваем памяць?..

...Цёплым надвячоркам 22 ліпеня людзі вярталіся хто з поля, хто з сенажаці. Натомленыя, наспех вячэралі, клаліся спаць. Трывогі не было, балазе мала хто ведаў, што кроў ужо пралілася: мінулай ноччу, употайкі, паліцаі паквіталіся з аднавяскоўцамі Рыгорам Зажэкам і Цімахом Хандрыкам. Таксама мала хто паверыў чуткам, нібыта солтысам (старастам) складзены нейкі чорны спіс. Нават тады, калі ў хаты пачалі ўрывацца ўзброеныя вінтоўкамі паліцаі, трывога выбухнула не адразу. Як на пільную працу, выпраўляла свайго мужа мая бабуля Ганна: падказала, дзе стаіць рыдлёўка, дагнала ў двары, каб падаць шапку. І толькі каля грузавіка, у якім сядзелі з кулямётамі немцы і каля якога выслужліва замахалі прыкладамі паліцаі, людзі напраўду спалохаліся, пачалі прасіцца.

Не магу тут абысці адзін высакародны і мужны ўчынак. У хату да васьмідзесяцігадовага Сямёна Цалагуза паліцаі прыйшлі па яго сына. Бацька ведаў, што той хаваецца ў гумне, аднак не выдаў, сказаў: «Я за яго, мяне бярыце». І ўзялі, забілі. Праўда, адпусцілі былі, але стары збіўся з дарогі, блукаў у сасонніку, дык забралі зноў, паставілі пад кулі. Каб не замінаў.

Там, дзе цяпер Курган, былі закатаваны дзевяцера мужчын, у іх ліку мой дзед Рыгор, якому акурат у той дзень стукнула сорак. Іх у вёсцы чакалі ўсю ноч, людзі часта выходзілі ў двары і прыслухоўваліся: мо вярнуліся? Не спалі таксама паліцаі, шныпарылі па вёсцы, раз'юшаныя крывёю і падагрэтыя гарэлкаю. Суседзі Мацвея Стральчэні чулі, як роспачна прасіў літасці гаспадар. Дарэмна…

Назаўтра людзі кінуліся шукаць сваіх блізкіх. Тое, што яны ўбачылі на чудзінскай галгофе, не паддаецца апісанню, і я не намагаюся гэта рабіць, хоць маю даволі падрабязныя і жудасныя ўспаміны сведкаў. Прывяду хіба што адзін — дзядзькі Костуся, сына першага калгаснага старшыні Хведара Захарчэні: *«Швагер бацькаў сказаў мне: пасля скрыжавання дарог балотца пройдзеш, там гільзы патронаў павінны валяцца, бо кулямёты ва ўсю рабілі. І праўда, я знайшоў рассыпаныя гільзы, пасля і пясок жоўты. Стаў разграбаць яго, наткнуўся на целы, выцягнуў бацькава. Страшна было глядзець. Ні на кім жывога месца не было, бо людаеды здзекаваліся з іх, пакуль пастралялі. Каго і паўжывога прысыпалі пяском».*

Пра нястрымную лютасць канваіраў сведчыць ужо тое, што траіх сваіх ахвяраў яны не давялі да агульнай мясціны расправы, а саштурхнулі з дарогі і пачалі забіваць — павольна, з перакурам, з асалодаю. Асалода была ад таго, што паліцаі выбралі ахвяраў паводле прынцыпу «і вашым, і нашым»: для немцаў — савецкія актывісты, для сябе — уласныя крыўднікі, чаго не ўтойвалі адразу, яшчэ калі выводзілі з хат. Хто помсціўся паплаўнічаму (вартаўніку) — маўляў, не даў пацягнуць з калгаснага поля, хто конюху — пашкадаваў калісьці каня, хто суседу па надзелах зямлі, хто брыгадзіру. Дзеду майму стрэлілі ў лоб, бо насіў, хоць і нядоўга, шапку з чырвонаю зоркаю: служыў пасля верасня 1939-га ў часовай міліцыі. Яму давялося везці падводаю ў раён рабочага тартака Міхала (прозвішча ў вёсцы не памятаюць) за нейкую правіннасць, Пасля гэтага Міхал не раз пагражаў: *«Ты мне тады і чорнай вады не даў папіць. Ніколі не забуду!»* І не забыў, калі запісаўся ў паліцыю. Дробязную помслівасць вылюдка адлюстроўвае і выпадак з Паўлюком Сергіенем, якому ў той жудасны дзень пашчасціла. Нават карнікі ўз'еліся, калі высветлілі, што Міхал помсціць таму за... курыныя яйкі! Аднак жа крыважэрнасць паліцаяў у астатніх выпадках узяла верх. Гэта яны вярнулі ў гурт пакутнікаў і старога Сямёна Цалагуза, і дваццацігадовага Аляксандра Лобуся, якога немцы спачатку таксама «пашкадавалі», мусіць, за маладосць, але потым саступілі сваім халуям. Найбольш ахвотна акупанты саступалі тым з іх, хто быў бліжэй да новай улады.

*"Сям'я майго свёкра,* — распавядае Марыя Васільеўна Сергіеня, гаспадыня на дзве асірацелыя хаты цяпер, — *мела няшчасце жыць поруч з Рыгорам Будчанінам. У вайну ён стаў солтысам, яго сын Яўхім — паліцаем. Іх і да таго недалюблівалі, трохі пабойваліся, Яўхім жа — першы забіяка на сяло. З суседзямі жылі кепска, мо і з Іванам Сергіенем, свёкрам маім, сваркі былі. Дык і паказалі на яго немцам. А ў яго — шасцёра дзяцей. У калгас ён пайшоў, каб неяк пракарміць іх, конюхам стаў... То за што? Не, забралі. Крыж на грудзях і крыж на спіне выразалі, у яму кінулі, як сабаку якога. Страшная, але святая мясціна. Муж мой Саша там вельмі часта бываў, дзяцей браў з сабою, зараз нашы ўнукі ездзяць».*

Каля Кургана памяці апошні раз я пабываў летась, а перад тым (чатыры гады назад) з бацькам. Дасюль вінавачуся, што падахвоціў старога прыйсці: тое, што мы засталі тут, яму, васьмідзесяцігадоваму інваліду вайны, здароўя не дадало. Не, Курган той жа, на тым жа месцы, толькі мемарыяльная пліта істотна абноўлена. Да дзевяці прозвішчаў чамусьці дапісалі яшчэ пяць, а над гэтым ахвярным спісам выбілі дзяжурнае і вельмі ж непраўдзівае: «Вечная



**Чудзін.**
**Брацкая магіла**
**на старых закрытых могілках.**

# ДЗВЕ ТРАГЕДЫІ АДНОЙ ВЁСКІ

память и слава павшим в боях за Родину».

Самая першая і найбольшая за ўсе гады вайны трагедыя для вёскі звялася, па сутнасці, да прапагандысцкага лозунгу. Раўнівыя абаронцы «савецкага патрыятызму» ў адзін момант пакутнікаў, што зведалі нялюдскія здзекі, пераўвасобілі ў герояў, як быццам без гэтага арэола іхнія загубленыя жыцці менеей значылі б перад Богам і нашчадкамі. І як быццам нашчадкам не трэба ведаць пра злачынствы здраднікаў і звычайных шкурнікаў-прыстасаванцаў. Але так ужо ў нас павялося: патрыятызм выхоўваць выключна на гераізме. Вось і адказ на маё даўняе юначае пытанне, чаму так доўга мясціна трагедыі не ўвекавечвалася наогул.

На шчасце, яшчэ застаюцца астраўкі памяці ўсвядомленай і прачулай. Такі «астравок» — па другі бок дарогі смерці, там, дзе трое з дзевяці пакутнікаў загінулі першымі. Сын аднаго з іх, Аляксандр Сергіеня, муж цяпер адзінокай жанчыны, чый успамін я падаў вышэй, паставіў невялікі металічны крыж і агароджу, не здаволены адной мемарыяльнай плітою на Кургане памяці. Мала дзядзьку Сашу было і таго, што прозвішча бацькава ўпісана яшчэ ў адзін мемарыял — у цэнтры вёскі, агулам, пад ужо знаёмаю «шапкаю» — «павшим в боях».

Крыжамі былі пазначаны ў Чудзіне іншыя мясціны, дзе загінулі вяскоўцы ў ліпені 1941 года і пазней. На жаль, драўляны крыж — знак нетрывалы, яго трэба з гадамі мяняць. Глядзіш — і ўжо няма каму або чаго крывіць душою, няма калі. Бальшавіцкі ваяўнічы атэізм зрабіў сваю справу, з-за яго на доўгі час пазнікалі крыжы і з ростані дарог. Добра, што многія магілы на старых чудзінскіх могліцах, няхай сабе цяпер зачыненых для пахаванняў, дагледжаны, балазе тут зноў правіць службу абноўленая Юр'еўская царква. Пад абеліскамі і помнікамі, пад аднымі дрэвамі і ў адной зямлі ляжаць і змагары з ворагам, і простыя вяскоўцы, што палеглі як ад рук фашыстаў ды іхніх паслугачоў, так і... Пра ахвяраў партызанскай акцыі — у другой частцы маіх нататкаў.

**Трагедыя другая:**
**1942 год, 14 кастрычніка**

Існаваў калісьці піянерска-камсамольскі рух з дэвізам «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Ніхто і нішто — гэта ў ідэале, на справе ж многія складаныя і трагічныя падзеі, што не ўмяшчаліся ў ідэалагічныя рамкі, змушана замоўчваліся, аддаваліся нябыту. А ў душах сведкаў ваеннага ліхалецця не праходзілі ні боль ад стратаў, ні нянавісць да забойцаў. Здраднікаў-паліцаяў, што чынілі гвалт у Чудзіне, тут памятаюць і сёння, каго больш, каго менш. Ведаюць далейшыя лёсы многіх з іх. Сцяпан Будчанін падарваўся на партызанскай міне, закладзенай пад чырвоным сцягам каля дарогі. Каменданта (ці намесніка каменданта) паліцыі Яна Саковіча і яго найпершага хаўрусніка Міхала застрэлілі самі акупанты, хоць, як сцвярджаюць найбольш дасведчаныя, не абышлося тут без антыфашысцкага падполля. Шкадуюць вяскоўцы, што Боская кара абмінула Яўхіма Будчаніна і Мікалая Мігая, а яны ж былі аднымі з самых рупных і жорсткіх фашысцкіх памагатых.

Людзі прагнулі помсты за ліпеньскую трагедыю сорак першага. Шмат хто, як і мой бацька, пайшоў у партызаны, а ў 1944-м — на фронт. Аднак ніхто з землякоў, з кім я гутарыў, зусім не схільны лічыць за помсту партызанскую акцыю супраць чудзінскай паліцыі ў кастрычніку сорак другога года. Яна, не да канца прадуманая і занадта расцугляная, абярнулася новай трагедыяй для вёскі.

Тады за адзін дзень згарэла дзве трэці сядзібаў — ці то 152, ці то 204, розныя крыніцы даюць розныя лічбы, але ў абодвух выпадках гэта больш, чым за ўсю вайну ў любой іншай вёсцы Ганцаўшчыны. Згарэлі, зразумела, не толькі тыя хаты, дзе жылі-сталаваліся паліцаі і адкуль іх «выкурвалі» народныя помснікі. Агонь не выбіраў, пляжыў усё запар. Згадвае жыхар Чудзіна Рыгор Якаўлевіч Барсукевіч: *«Спярша партызаны прагналі паліцаяў. Я ў акно пазіраў: беглі, лаяліся, стралялі. Адных і другіх было чалавек па дзесяць, мо трохі больш... Пагоня нічога не дала, ужо блізка пачынаўся алешнік, паліцаі там пахаваліся, а мо і залеглі, ва ўсялякім разе сунуцца за імі было небяспечна. Дык партызаны злосна павярнулі назад, у сяло, і хутка сяло загарэлася. Ніхто яго не тушыў: падняўся такі вецер, што попел ад саламяных стрэх, як расказвалі пасля, далятаў да Рожана, гэта амаль паўтара дзесятка вёрст. Паспрабуй патушыць!»*

Сам пажар быў вялікай бядой: набліжалася зіма. Пагарэльцы туліліся ў сваякоў і проста ў спагадлівых гаспадароў, затым пачалі капаць зямлянкі. У іх і перазімавалі. І ўсе ж самае страшнае было не ў пажары. Палячы вёску, партызаны далі поўную волю рукам: прабілі штыком плячо аднаму з мужчын, бахнулі з вінтоўкі ў жанчыну, што высунулася з акна, скалечылі твар ёй... Гэтага мала: чатырох чалавек партызанскія кулі скасілі напавал, прычым не толькі тых, што прынялі на па¬стой здраднікаў. Вось успамін Фёдара Арцёмавіча Савені, сына аднаго з забітых: *«Было каля сямі гадзін раніцы. Бацька сядзеў ля стала апрануты. Дый мы ўсе папрачыналіся. Уваходзяць партызаны, удвух ці утрох: «Ты хазяін?» Кажа: я. А ён жа гаспадаром хаты не быў, мы ў чужой жылі, у нас на ўскрайку сяла стаяў толькі зруб. Ці кватаравалі раней тут паліцаі, не ведаю. Партызаны ні пра што больш не пыталіся, загадалі: хадзем. Маці і мы, чацвёра дзяцей ад пяці да трынаццаці гадоў, загаласілі, пахапаліся за бацьку, выйшлі з ім на двор. Нас адапхнулі, параскідвалі, вывелі бацьку за варотцы і адразу стрэльнулі у патыліцу. Ен упаў у канаву. Хату падпалілі, але няўдала першы раз, дык вярнуліся, расклалі агонь з сухога ільну ў сенях... Мы хавалі бацьку, калі ўжо сонца садзілася. Мылі ў агародзе, ён абгарэў, дык папрасілі адзежу ў суседзяў...»*

Дадам немалаважны штрых: Фёдар, калі ішоў у войска, прынцыпова адмовіўся ад парады ваенкаматчыка замяніць праўдзівы запіс у асабовай справе на бяспечны і зручны: маўляў, бацька забіты фашыстамі. *«Пішыце як ёсць — партызанамі»*, — сказаў ён рашуча.

У той кастрычніцкі дзень сорак другога разам з Арцёмам Савенем загінулі Аксеня Каско (родам не адсюль, з Рожана), Васіль Сергіеня, Мікіта Цалагуз. Паліцаі ў хаце апошняга не стаялі, гэта дакладна, яго забілі, калі ён ратаваў ад агню куфар з дабром. Урэшце, стаялі ці не, не ад людзей залежала. Хіба першыя двое самі запрасілі нягоднікаў? *«Забівалі за што папала,* — з абурэннем прыгадваюць вяскоўцы. — *Зірнуў нядобра, ці ты сказаў што, ці паліцьянта ў хату ўзяў, як Аксеня-ражанка. Яна пляменніка ж узяла. Што, не браць, падстаўляць каго другога? Але ж хто тады разбіраўся? Сёння не разбіраюцца, а то — война!..»*

Імёны чацвярых у афіцыйныя спісы ахвяраў вайны, канечне, не трапілі, гэта пярэчыла б прапагандысцкім канонам. Яшчэ б! Калі ўжо нівелююцца імёны палеглых ад рук карнікаў, дык што казаць пра забітых сваімі: маўляў, на вайне ўсялякае бывае, выпадковыя страты на ёй непазбежныя. А ці такія ўжо непазбежныя? Сведкі той партызанскай акцыі зусім не схільныя сцвярджаць, што ўсім яе ўдзельнікам агонь і кроў засцілі вочы. Нязменна кажуць пра такі выпадак. Стаяў тады перад тварам смерці і родны брат забітага Васіля Сергіені Дзмітрук, той, у каго патрапіў штык. Уратавала хлопца не толькі тоўстая суконная адзежына — ўратаваў другі партызан, які схапіў за рукі свайго напарніка: «Ты што робіш? Што ты робіш?!» Ледзь-ледзь не пабіліся паміж сабою.

Так што і няпоўная праўда ёсць хлусня. Мне, напрыклад, заўсёды карцела даведацца, ці раскайваюцца ўдзельнікі вайны — не адпетыя мярзотнікі і здраднікі, для якіх вайна адно і вінаватая, а тыя ж партызаны і франтавікі — за неапраўданую жорсткасць, праяўленую няхай сабе імгненна, падсвядома? Зразумеў, што далека не ўсе. Нейкі Буга, партызан, на руках якога кроў жыхароў Чудзіна, у Чудзін жа і прыехаў у мірны час. Працаваў у бібліятэцы, часта падвясельваўся гарэлкаю, хадзіў кандыбоберам і не зважаў на асуджальныя позіркі і словы людзей. Падобных да яго нямала, і ўсё ж спавядальныя прызнанні і абвінавачванні надараюцца. Яны хоць і трывожаць, гнятуць, аднак не адчужваюць ад чалавека, наадварот, вяртаюць веру ў яго. Ды зноў жа: наша грамадства, заідэалагізаванае за гады і дзесяцігоддзі, прагне веры абсалютна чыстай, без найменшага сумнення. Хіба адназначна, асабліва на афіцыйным узроўні, былі ў свой час успрыняты споведзі беларускіх хатыняў, сабраныя ва унікальнай кнізе «Я — з вогненнай вёскі»? Жывыя галасы цудам ацалелых людзей асудзілі не толькі фашызм, а і таталітарызм увогуле; у многіх з іх прагучаў дакор у адрас народных помснікаў, якія нярэдка правакавалі карнікаў, добра ведаючы, што не здолеюць абараніць мірных жыхароў; было і тое, што дало падставу ўсумніцца ў нібыта непагрэшнай еднасці «савецкага народа», у выключнай сіле і мужнасці кожнага «савецкага чалавека».

Мы звыклі шукаць гераізм у любой бядзе і, насуперак праўдзе, па-ранейшаму знаходзім яго: у афганскай вайне, што забрала або пакалечыла тысячы маладых жыццяў, у чарнобыльскай катастрофе і нават у яе наступствах, якімі адважна грэбуюць вяртанцы ў забруджаную зону. *«Нельга пярэчыць волі і выбару людзей!»* — неаднойчы апраўдвалі гэтых чарнобыльскіх «герояў» прэса і тэлебачанне, апраўдваючы на самой справе бездапаможнасць і ў вялікай ступені абыякавасць дзяржавы.

Што ж, сумленнасць і крывадушнасць, споведзь і замоўчванне, добрае і ліхое — усё павінна застацца на скрыжалях памяці. Праўдзівай памяці, бо толькі тады яна — святасць.

**Алесь КАСКО.**

http://gants-museum.ucoz.com/publ/1-1-0-66

# ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАННЯ
## НА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЕ

**На працягу многіх стагоддзяў на Берасцейшчыне будаваліся цэрквы, касцёлы, сінагогі і іншыя культавыя пабудовы. Многія з іх папоўнілі скарбонку архітэктурных помнікаў Беларусі, але вялікая частка пабудоў да нашага часу не дайшла з-за войнаў і разбурэнняў. Трагічныя падзеі напаткалі культавую спадчыну і ў XX стагоддзі. Заходнія рэгіёны Беларусі, якія ў 1920-1930-я гады знаходзіліся ў складзе Польшчы, мінула разбуральная сіла савецкага “ваяўнічага атэізму”, але пасля II Сусветнай вайны распачалася новая хваля барацьбы з рэлігіяй, якая ахапіла і заходнебеларускія землі.**



**Касцёл Узвышэння Св. Крыжа ў Івацэвічах. Пабудаваны ў 1750-х гг. Зруйнаваны ў 1949 г., да гэтага быў пераабсталяваны пад пякарню ў лагеры ваеннапалонных пры будаўнічым раёне №10 НКУС. Здымак Юзафа Шыманьчыка 1927 г.**



**Касцёл Звеставання Панне Марыі ў Ганцавічах. Пабудаваны ў сяр. 1930-х гг. Знішчаны ў 1957 г. З яго матэрыялаў збудавалі летні тэатр.**



**Капліца Св. Георгія на вайсковых могілках Першай сусветнай вайны ў Пінску. Пабудавана пасля 1915 года. Знішчана ў 1960-х гг. Малюнак М. Казлоўскага**

Сярод шматлікіх накірункаў і метадаў барацьбы з рэлігіяй асобнае месца займала закрыццё і руйнаванне культавых пабудоў: цэркваў, касцёлаў, капліц, сінагог, малітоўных дамоў.

У першую чаргу, ад гэтай палітыкі пацярпелі Праваслаўная і Каталіцкая цэрквы Берасцейшчыны. Для католікоў вобласці пасляваенны час быў даволі складаным. Калі ў 1939 г. на Берасцейшчыне жыло 143 575 чал. каталіцкага веравызнання, 219 святароў, то пасля II Сусветнай вайны засталіся дзеючымі 43 касцёлы і 5 кляштароў. Першапачаткова мелася 32 святары, але пасля рэгістрацыі 1949 г. па вобласці засталіся дзеючымі 18 касцёлаў, у якіх служылі толькі 5 ксяндзоў. Адразу пасля вызвалення Беларусі ў адносінах да каталіцкіх святароў распачалася хваля рэпрэсій, у выніку якіх без ксяндзоў засталіся 28 касцёлаў у Баранавіцкай вобласці, па 6 – у Брэсцкай і Пінскай абласцях (сёння тагачасныя Баранавіцкая і Пінская вобласці – у складзе Брэсцкай). Абсалютная большасць існуючых каталіцкіх касцёлаў і капліц не дзейнічала.

Вялікая частка будынкаў Каталіцкай царквы была разбурана ў часы Вялікай Айчыннай вайны: касцёл у в. Альшова (Бярозаўскі р-н), драўляны мужчынскі манастыр у Брэсце, капліцы ў в. Бакуны (Пружанскі р-н), у г. Бяроза, в. Дубіца (Брэсцкі р-н), в. Паляцічы (Кобрынскі р-н). Гэтаксама ў час вайсковых дзеянняў былі спалены касцёлы ў в. Заосце (Жабінкаўскі р-н), в. Збураж (Маларыцкі р-н), будынак драўлянага гарнізоннага касцёлу ў Кобрыне і інш.

Вялікая частка касцёлаў і капліц была закінута, многія пуставалі. Пустуючым згадваецца старадаўні касцёл 1648 года ў в. Асавая, касцёл у в. Мерлін на Століншчыне, мураваная капліца ў в. Ракавіца Брэсцкага раёна. У 1946 годзе ў вельмі кепскім стане знаходзіўся касцёл з родавай спадчыны Нямцэвічаў у в. Скокі Брэсцкага раёна, што размяшчаўся на тэрыторыі сядзібы. Дзверы і вокны касцёла былі разламанымі, іканастас і рэлігійныя абразы – знішчанымі. Пасля расследаванняў раённай пракуратуры было ўстаноўлена, што ў Скоках стаяла вайсковая частка, якая і выкарыстала ўсё вышэйазначанае ў якасці паліва. Да нашага часу гэты касцёл не захаваўся.

Разбурэнні будынкаў каталіцкай царквы распачаліся адразу пасля вайны. У ліку першых былі зруйнаваны драўляная капліца ў в. Грыўда Іванаўскага раёна, мураваныя капліцы ў в. Дзяды Шарашоўскага раёна, в. Мінковічы Высокаўскага раёна і інш. Мураваны касцёл у Івацэвічах быў зруйнаваны ў 1949 годзе, да гэтага ён быў перабудаваны і абсталяваны пад пякарню ў лагеры ваеннапалонных пры будаўнічым раёне №10 НКУС.

На пачатку 1960 гадоў былі разбураны касцёлы ў г. Бяроза, г. Ганцавічы. У в. Дзераўная Баранавіцкага раёна касцёл быў разламаны, яго матэрыял быў выкарыстаны пры будаўніцтве прыбудовы да школы (звесткі пач. 1960-х гг.). Пасля закрыцця ў 1962 г. быў зруйнаваны касцёл у в. Макееўшчына Ляхавіцкага раёна, вядомы з 1916 года.

Цяжкае становішча мела Праваслаўная царква Берасцейшчыны. Шмат царкоўных будынкаў было разбурана ў час II Сусветнай вайны, асабліва ў партызанскіх зонах. Пасля вызвалення Беларусі Праваслаўная царква, у адрозненне ад Каталіцкага касцёлу, атрымала некаторую палёгку, савецкая дзяржава першапачаткова не пярэчыла адкрыццю і будаўніцтву цэркваў. Закрыццё цэркваў адбывалася толькі пры стварэнні памежнай зоны па р. Буг і новай мяжы паміж ПНР і СССР, усталяванай ў 1945 годзе. Напрыклад, у в. Крынкі Высокаўскага раёна царква была закрыта ў 1947 годзе, пазней разбурана. Праз год былі зачынены цэрквы ў в. Харсы і в. Дамачава.

У 1952 годзе ў в. Сяхновічы была разбурана званіца адкрытага тыпу: “навес для колоколов (отдельно от церкви) на деревянных столбах признан аварийным и по ветхости подлежит разборке” (паводле акта ад 25.10.1952 г.).

У 1954 годзе ўзнікла праблема адносна пабудовы царквы ў в. Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна. Настаяцель прасіў дазволу на яе аднаўленне. Царква, пабудаваная ў XIX стагоддзі, была спалена ў 1943 годзе. 28 красавіка 1954 года часовае памяшканне малітоўнага дома таксама было спалена, і прыход быў зачынены. Вернікам не было дазволена адбудоўваць царкву за ўласны кошт. Савецкая ўлада ў асобе чыноўнікаў настойліва адмаўляла ў адкрыцці новых прыходаў, а ў наступныя гады рознымі спосабамі імкнулася ліквідаваць ужо існуючыя.

У пачатку 1957 года была зруйнавана царква ў в. Альшова, якая не дзейнічала з 1934 года. У гэтым жа годзе праўленне калгаса ў в. Шэйпічы Пружанскага раёна, па ўзгадненні з упаўнаважаным па справах РПЦ і іншымі органамі, зруйнавала вясковую капліцу (былая ўніяцкая, XVIII ст.).

Актывізацыя барацьбы з праваслаўнай царквой пачалася ў 1960 годзе, калі

# КУЛЬТАВАГА ДОЙЛІДСТВА

## Ў 1945-1965 ГАДАХ



**Вялікая сінагога ў Пінску перад знішчэннем ў 1960-х гг. Пабудавана ў 1506 г.**

распачалася мэтанакіраваная палітыка ціску на дзейнасць цэркваў. Праца органаў улады ў гэты час была непасрэдна скіравана на “скарачэнне сеткі цэркваў”. За адзін толькі 1960 год на Берасцейшчыне было закрыта 56 цэркваў. Паводле звестак на сакавік 1965 года, было зачынена 165 праваслаўных цэркваў.

Пасля закрыцця шматлікія цэрквы руйнаваліся. Напрыклад, на Століншчыне прапанавалася знесці цэрквы ў Століне (могілкавая царква), вёсках Відзібор, Юнішча, Цмень, Калоднае, Варані, Аўсемірава, Дубай-Зарэчны. Будынак царквы ў в. Храпуны да гэтага часу ўжо быў спалены.

Асаблівай актыўнасцю пры разбурэнні цэркваў вылучыліся кіраўнікі Камянецкага, Столінскага і Маларыцкага раёнаў.

23 лютага 1965 года абласныя ўпаўнаважаныя па справах РПЦ і рэлігійных культаў Іваноў і Стральчонак просяць выканаўчыя ўлады вырашыць пытанне адносна зачыненых памяшканняў, 66% з якіх у гэты час не выкарыстоўваліся. У сувязі з гэтым савецкія чыноўнікі прыходзяць да наступнай высновы: “...прыстасаванне культавых пабудоў пад складскія памяшканні па-сутнасці не вырашаюць пытання аб іх выкарыстанні, так як пры гэтым захоўваецца знешні царкоўны выгляд... Прыстасаванне зачыненых культавых памяшканняў пад грамадскія патрэбы на месцы прадстаўляе цяжкасці. Усе зачыненыя цэрквы і касцёлы маюць спецыфічную архітэктуру. Напрошваецца вывад аб зносе большасці памяшканняў. Зачыненыя праваслаўныя цэрквы ў сельскай мясцовасці ў большасці драўляныя. Пры іх зносе матэрыял можа быць выкарыстаны пад школы, фельшэрска-акушэрскія пункты і для іншых грамадскіх патрэб. Патрэбна вырашыць пытанне аб выкарыстанні або зносе 143 культавых памяшканняў, з іх 33 знаходзяцца на могілках. Пры зносе ці рэканструкцыі не выключаецца магчымасць супрацьдзеяння ў той ці іншай форме з боку вернікаў. Гэта неабходна ўлічваць і заўчасна праводзіць некаторую працу”.

Праз некаторы час з’яўляецца рашэнне выканаўчага камітэта Брэсцкага абласнога савета дэпутатаў “Аб выкарыстанні зачыненых памяшканняў рэлігійных культаў па вобласці”. Згодна гэтаму рашэнню, выканкамы раённых і гарадскіх саветаў працоўных дэпутатаў абавязалі ў месячны тэрмін разгледзець асобна кожнае культавае памяшканне (сюды ўключаны цэрквы, касцёлы, сінагогі і інш.) і пытанні яго выкарыстоўвання на месцы, або зноса, вызначыць для якіх мэтаў можна выкарыстоўваць тое або іншае памяшканне пасля яго разборкі. Да 1 верасня 1965 года загадвалася скончыць працу па прыстасаванні або зносе зачыненых культавых пабудоў і праінфармаваць аб праведзенай працы аблвыканкам, працу “арганізаваць прадумана, каб не дапусціць непажаданых выступаў вернікаў”. Дакумент быў падпісаны старшыней Брэсцкага аблвыканкама К. Мацюшэўскім і сакратаром А. Ярашэнка. Дакладных звестак, наколькі поўнасцю быў рэалізаваны гэты праект, няма, але можна дапусціць, што такую пастанаўку пытання мясцовыя ўлады праігнараваць не змаглі.

Разбурэнні культавых пабудоў закранулі і іудзейскія абшчыны. У адрозненне ад хрысціян, іудзеям не вярталі сінагогі (за выключэннем некалькіх выпадкаў). У атэістычным СССР да іх ставіліся насцярожана. Паводле вышэй згаданага дакументу (1965 г.), распачаліся пераабсталяванні сінагог пад розныя гаспадарчыя патрэбы. Пад Дамы культуры сінагогі былі пераабсталяваныя ў в. Моўчадзь, Новая Мыш, Гарадзішча Баранавіцкага раёна, у г. Камянец (драўляная сінагога), у в. Пагост-Загародскі. Пад склад выкарыстоўваліся сінагогі ў г. Высокае (драўляная манументальная сінагога) і ў г. Ружаны. У Кобрыне сінагога была прыстасавана пад піваварню. Сінагогі ў Брэсце і Пінску былі пераўтвораны ў спортзалы. Некаторыя сінагогі былі перароблены ў кінатэатры, нарыклад, у Антопалі.

Горшы лёс напаткаў сінагогу ў Іванаве, яна была разбурана напачатку 1960-х гадоў. У гэты час у Пінску пры рэканструкцыі галоўнай плошчы была зруйнавана сінагога, вядомая з XVI ст. Гаспадарчае выкарыстанне сінагог прывяло да таго, што частка з іх да сённяшняга часу не дайшла, брольшасць знаходзіцца ў дрэнным стане.

Сёння, аналізуючы і ацэньваючы праявы палітыкі савецкай улады ў адносінах да культавага дойлідства на Берасцейшчыне, можна канстатаваць сумныя наступствы гэтага цемрашальства. Вялікая колькасць помнікаў даўніны, драўляных цэркваў, касцёлаў, старадаўніх капліц, якія з’яўляліся неад’емнай часткай культурна-гістарычнай спадчыны нашага народа, выканала ролю закладнікаў барацьбы бальшавікоў з рэлігіяй.

**Аляксандр СТРОКАЧ.**
**г. Берасце**



**Царква Св. Параскевы Пятніцы ў в. Качановічы (Пінскі р-н). Пабудавана ў XVIII ст. Знішчана ў 1960-х гг. Малюнак М. Казлоўскага**



**Вучні школы каля царквы Св. Мікалая ў в. Лактышы Ганцавіцкага р-на. Пабудавана ў 1792 г., перабуд. ў 1864 г. Знішчана ў 1950-х гг. Здымак 1950-х гг.**



**Касцёл Маці Божай Чэнстахоўскай у в. Богдзюкі (Жабінкаўскі р-н). Разабраны ў 1958 г. Матэрыял пайшоў на адбудову сельскага**

# Дым з коміна

**Аселіца**

Вясной аселіцу залівала талая вада. Вада награвалася на сонцы, паціху спадала. Уся лугавіна пакрывалася кволай травой, і ў гэты светла-зялёны дыван густа ўпляталіся жоўтыя бліскучыя кветкі курынай слепаты.

Як добра было нам, малечы, лётаць, гойсаць на выгане, назіраць, як зззяюць, іскрацца на сонцы ўзнятыя табой, тваімі таварышамі вадзяныя пырскі!

Але аднаго дня прагрукаталі па аселіцы два магутныя трактары, якія цягнулі за сабою вялікі плуг. Так з'явілася на лузе шырокая чорная баразна. Пазней экскаватарам яе паглыбілі.

Цяпер на аселіцы расце крапіва, піжма, дзядоўнік. І не ляцяць больш вадзяныя пырскі з-пад дзіцячых ног, і не цвіце больш бліскучая жоўтая курыная слепата…

**Абнаўленне**

Майская раніца. Ясная, чыстая, сонечная. Неадольны, няўхільны, вечна юны час пераўтварэння, пераменаў.

Інакш не сказаш. Ну хоць бы вось гэты стары цёмны клён з парэпаным вужавым камлём. Яшчэ нядаўна непрыветна чарнеў ён, раскінуўшы ва ўсе бакі нязграбныя рукі – ралы, а цяпер цешыць вока далікатнай салатавай лістотай, аблашчаны, заліты морам агнявога сонца.

Расце стары клён пры гасцінцы, невядома калі і кім пасаджаны. Адразу за клёнам я мінаю яго, з гасцінца прастую ў вёску.

А ў вёсцы гэтай жывуць мае добрыя знаёмыя: дзед Трахім і баба Ганна. Дзед Трахім – некалі славуты каваль, баба Ганна – вядомая на ўсю акругу пяюха. Чароўны голас, добрая памяць на песні ў бабы Ганны. Іх я праведваю часта, добра знаёмы з усімі сямейнікамі.

Прыехаў – і ў іх перамены, і ў іх абнаўленне: перакрываюць новым шыферам хату. З гэтай нагоды сабралася ўся вялікая сям'я. Ажно чатыры пакаленні. Ад дзеда з бабай да праўнукаў.

Мужчыны пад камандай дзеда перакрываюць дах, уся жаночая палавіна і дзеці (вядома, галоўная ў іх баба Ганна) парадкуюць агарод і сад – выграбаюць леташняе лісце, бе-ляць сад, капаюць грады.

І я далучаюся да гэтага вялікага мурашніку, і мне хораша, і весела ў гэткім гурце.

Калі селі адпачыць, заўважыў шчабятлівых ластавак, якія ў дзюбках насілі гразь і ляпілі гняздо ў вільчыку страхі дзедавай пуні.

Вясна, для ўсіх вясна. Рупная, чароўная, непаўторная.

**Адзінота**

Свежы майскі ранак. Еду па ціхай вясковай вуліцы. Ужо даўно пракрычалі, абвясцілі новы дзень гарластыя, галасістыя пеўні, і цяпер сонца лашчыць светла-зялёныя лісточкі, якія цнатліва, нявінна туляцца да галін. Па-над платамі цвіце белая бухматая чаромха, поўніць дурманлівым пахам празрыстае паветра.

Мяне абганяе на матацыкле малады хлапчына і далёка наперадзе супыняецца каля хаты, атуленай галінастым зялёным дрэвам. Бачу: з веснічак выбягае-вылятае, як птушка, дзяўчына, апранутая ў лёгкі блакітны плашчык, сядае да яго, тут жа прыціскаецца, туліцца да шырокіх плячэй юнака. Матацыкл пускае паласу сіняга дыму, рушыць з месца і нясе іх у вясну, у чаромхавы зманлівы пах…

О, толькі цяпер разумею, чаму сёння мне так сумна і няўтульна ў гэтай вясенняй красе. Проста я адзін, і да маёй спіны ніхто не туліцца, і мне няма каму крычаць насуперак ветру, славіць гэтую веснавую прыгажосць...

**Майскі дождж**

Цёплы майскі дождж застаў якраз у лесе. Прытуліў мяне густы высокі ельнік. Ціха шапацеў дождж, пад елкай было ўтульна і суха, згінулі, пахаваліся камары, і я задрамаў…

Калі адплюшчыў вочы, свяціла яснае сонца. Лес поўніўся вясёлымі нястомнымі галасамі птушак, лес іскрыўся, зззяў кожнай дажджынкай на кволых салатавых лісточках. Але пастаяць, палюбавацца на красу не давалі дакучлівыя, нахабныя камары.

…Ельнік раптоўна скончыўся, і зроку адкрылася мяккая чыстая зеляніна жытнёвага поля, над якой вілася лёгкая пара. Было бачна, як на вачах большае жыта. Ці гэта мне здалося?.. Ці гэта завараджыла тонкая, мярэжная пара над зіхоткім полем?.. Адно ведаю: буду ехаць палявой дарогай пасярод свежай чыстай руні, як плыць па чароўнай рацэ…

**Малітва**

Ціхі свежы ранак. Прачынаецца вёска. І тут, і там цягнецца з комінаў, шукае дарогу да неба лёгкі дым. Спрадвечная вясковая малітва жыццю, урачысты гімн яму — дым з коміна.

**Казка**

Заехаў у вёску і анямеў ад здзіўлення. Як жа! Чыстыя белыя аблачынкі спусціліся з нябёсаў і атулілі хаты. Цвіце язмін!

**Дождж у полі**

Проста на палявой дарозе застаў густы, спорны дождж. Схавацца няма дзе: абапал дарогі ў нізкіх мясцінах расце толькі малады альшэўнік. Адвязаў ад багажніка непрамакальны плашч, апрануў, еду.

Хутка ў каляінах з'явіліся лужыны, стала гразка, але матацыкл упарта рухаўся наперад. Дальбог, ажно пашкадаваў яго, як шкадуюць жывую істоту: мяне бароніць плашч ад вадзяной навалы. А яго?

**Букет**

На ціхай палявой дарозе сустрэў пажылую жанчыну і, відаць, унучку яе — дзяўчынку-падлетка. У абедзвюх у руках — вясёлкавы букет палявых кветак. Падумаў: толькі добрая, мудрая старасць і чыстая, светлая маладосць умее бачыць, захапляецца прыгажосцю…

**Клічуць далі**

З прыемнай прахалоды лесу зноў трапляю ў мройную гарачыню спякотнага летняга дня. З гары любуюся новым адкрытым абсягам, які звыкла канчаецца сіняй зубчатай паласой далёкага лесу.

Увесь абшар пярэсціцца роўнымі прастакутнікамі палёў. Справа ад мяне буйна кусціцца сіва-зялёны авёс, за ім, адразу за нізінкай, палавее жыта, злева млее на сонцы бура-малінавы палетак канюшыны,а проста перада мной хораша цвіце звонкі сіні лён.

Часам прабяжыць гарачы вецер, калыхне збажыну, і яна захвалюецца, высвеціцца, адкрыецца новымі адценнямі і фарбамі. Чаруе, захапляе і гэты чубок векавечных ліп у полі — адзнака старасвецкай сядзібы, і белыя выразныя абрысы царквы на далёкім узгорку, і плаўныя кругі каршачка ў небе. Здаецца, і ехаць не трэба, а толькі легчы і любавацца да ночы гэтым цудоўным краявідам. Але ж не. Цягне, вабіць да сябе новая даль, новы неабжыты прастор. А дарога вось, перад табою…

**Алесь ЗАЙКА,**
**в. Заполле, Івацэвіцкі раён**



# ЗАБАБОНЫ ЗАПАЛЯНЦАЎ

**Прапануем вашай увазе забабоны, запісаныя краязнаўцам Аляксандрам Зайкам (в. Заполле Івацэвіцкага раёна). Першыя 33 забабоны запісаныя ў 1984 г. ад жыхаркі в. Заполле А.А.Вясны, 1901 года нараджэння. Забабоны 34-41 запісаныя ў 1991 г. ад М.М.Шчурко (Заполле), 1930 года нараджэння. Забабоны 42-53 запісаныя ў 1991 г. ад В.Т.Доўжык (Заполле), 1907 года нараджэння.**

1. Перабяжыць чорны кот дарогу — не пашанцуе.
2. Перайдуць дарогу з пустым вядром — не пашанцуе.
3. Перайдуць з поўным вядром дарогу —пашанцуе.
4. Перабяжыць кот дарогу — вазьміся за гузік.
5. Пакладзеш кнігу пад падушку — верш лепш запомніцца.
6. Пакладзеш грэбень пад падушку — расчэша валасы твой жаніх.
7. Кладучыся спаць, надзенеш на левую нагу шкарпэтку — зніме ноччу твой суджаны.
8. Калі пакладзеш люстэрка пад падушку — прысніцца каханы.
9. Калі адправішся ў дарогу і першай сустрэнецца жанчына, не пашанцуе альбо нешта дрэннае здарыцца.
10. Калі спалохаешся, плюнь тры разы на зямлю.
11. Спалохае сабака — выстрыжы поўсць у яго і абкурыся.
12. Цяжарнай жанчыне нельга пляваць на падла — будуць у дзіцяці гнаіцца дзёсны.
13. Калі малое дзіця зробіць першы крок, нажом правядзі паміж ног тры разы ў яго, то хутчэй пойдзе.
14. Не глядзі ў пабітае люстэрка — нешта дрэннае здарыцца з табой.
15. Сабака страшна вые — нехта памрэ.
16. Сарока ў акно пастукае — навіна добрая.
17. Не змятай прыпек да сябе — хвароба, ці нешта дрэннае здарыцца.
18. Еш хлеб цвілы — грому не будзеш баяцца.
19. Калі навальніца, не садзіся каля акна, можа забіць.
20. Калі страшны гром, прачытай малітву.
21. Калі апоўначы нехта будзе стукаць ў хату страшным грукам,прачытай малітву і ўсё прападзе.
22. Не хадзі ноччу на могілках — можа вылезці з ямы пакойнік.
23. Не выходзь з хаты ў поўнач ў той дзень, калі быў пакойнік, — забярэ да сябе.
24. Пападзеш паміж аднолькавых імён — загадай жаданне.
25. Лаўровы лісток у супе — пісьмо прыйдзе.
26. Нос чэшацца — нешта чуе.
27. Левае вока чэшацца — добрае ўбачыш.
28. Правае вока чэшацца — кепскае.
29. Вушы гараць — нехта абгаворвае.
30. Шчокі гараць — думае пра цябе нехта.
31. Правая рука свярбіць — з некім здаровацца будзеш.
32. Нельга чытаць, калі ясі, а то з'ясі ўсю памяць.
33. Няможна месці надворак вечарам — вымецеш хлопца.
34. Чэшацца левая рука — будзеш грошы лічыць, ці дарога будзе.
35. Свярбіць пераносіцца — пачуеш, што нехта памёр.
36. Прыйдзе на стары новы год першым у хату мужчына — будзе ўдача цэлы год.
37. Вернешся, выбраўшыся ў дарогу, не павязе.
38. Аддай доўг перад Паскай, бо будзеш увесь час у даўгу.
39. Еш чорную скарынку — не будзеш баяцца грому.
40. Адзеў нешта навыварат, нехта наб'е.
41. Хлеб са стала ўпадзе — будуць госці.
42. На вялікае свята не пазычай нікому грошай.
43. Як вязеш парасяты на базар і хочаш, каб не звяліся, трэба выстрыгчы поўсць у парасят і ўсадзіць за прушняк.
44. Як прадаеш парасяты, не трэба даваць купцу завязкі ад мяшка і прадаваць са сваім мяшком.
45. Не трэба змятаць лаву або стала венікам, бо будзе сварка ў хаце.
46. Цяжарнай жанчыне не трэба адліваць ваду з вядра ў калодзеж, бо будзе дзіця ванітаваць.
47. Цяжарнай жанчыне нельга пералазіць праз кручаны дрот, бо дзіця будзе абмотана наўкруг шыі пупавінай.
48. Выпадзе з вока вейка, угадаеш, з якога вока, жаданне споўніцца.
49. У панядзелак нельга падмятаць хату, бо будзе сварка ў хаце.
50. Не можна біць венікам хлопцаў і дзяўчат, бо не будуць жаніцца і выходзіць замуж.
51. Нельга спаць у нядзелю да абеда.
52. У гаспадыні абвальваюцца ў печы дровы — прыйдзе госць.
53. Калі сава гукае, то, гавораць, пакойніка чакае.

# “НА ПЛЫНЯХ ВЯСНЫ”

## Берасцейскі гурт “Спрат” запісаў міні-альбом

**Беларускамоўны гурт з Берасця “Спрат”, што ўжо паспеў сыграць на сцэне з многімі гуртамі нашай краіны, а таксама выпусціць свой дэбютны паўнавартасны альбом “Не чакай”, нядаўна запісаў міні-альбом “На плынях вясны”.**

Міні-альбом ёсць вынікам супрацоўніцтва з гукарэжысёрам Анатолем Харытонавым (дарэчы, супольна з ім запісаная і першая кружэлка). Паводле зместу “Не чакай” атрымаўся ў нечым падобным да сімвалічнага звяна, якое злучае тэматыку і адметныя рысы песняў першага альбому з досыць новым гучаннем, скіраванасцю і зменамі ў стылістыцы “Спрата”. Спадзяемся, нам нарэшце-такі ўдалося ўвасобіць усё гэта не толькі на канцэртах, але і падчас плённай студыйнай працы.

Былі запісаныя як “правераныя” шматлікімі выступамі песні (напрыклад “Казачныя Сны”), так і, у якасці невялічкага эксперыменту, творы, якія да запісу міні-альбому ўвогуле нідзе не гучалі і не выконваліся (“Памірае свет” і “Адчуй”).

Таму запрашаем слухачоў да водгукаў, каментароў, крытыкі і проста выказвання думак на сайце www.sprat.name ці на старонцы гурта “Укантакце”.

Дарэчы, усе трэкі мініальбому “На плынях вясны” размешчаныя ў сеціве для свабоднага спампоўвання.

**budzma.org**




**Вокладка новага альбому гурта “Спрат”**

# СПОРАЎСКІЯ ПОКАЗКІ

Споравец прыходзіць дамоў, хваліцца жонцы:

- Жонка, каб ты ведала, як я сёння пана аканома абхітрыў. Прынёс яму ладную вязку рыбы, а пан за гэта мяне гарбатай напаіў. Але як пан аканом адвярнуўся, то я кавалачак цукру са шклянкі і выняў.

І пачаставаў споравец кавалачкам цукру сваю любую жонку.

*****

Прыехаў споравец з мястэчка, паказвае курынае яйка і хваліцца жонцы.

- Вось гэтым мацаком я на Вялікдзень усім велікодныя яйкі паб'ю.

А жонка ўзяла яйка, што знесла рабая чубатка, ды пабіла мужава мацака.

Споравец гневаецца:

- Жонка, ці маеш ты розум? Я ж местачкоўцу за гэтага мацака два дні поле гараў.

*****

Спораўцы так закручваюць лямпачку.

Адзін на стале з лямпачкай, чатыры, пабраўшыся за канты, круцяць стол, а шосты ходзіць у супрацьлеглы бок, каб у іх галава не закружылася.

*****

- Чаму спораўцы агуркі соляць у бочках, а не ў слоіках?

- Бо галава не ўлазіць, каб есці іх, - смяюцца спораўцы.

*****

Пайшоў споравец касіць ды праспаў цэлы дзень на тым сенакосе. Прыйшоў вечарам, а жонка сала пашкадавала. То ў злосці споравец сказаў жонцы: "Не дала сала, то каб на той сенажаці ўся трава ўстала". І дадаў: "Сама пойдзеш грабці."

Пайшла жонка грабці, а там уся трава стаіць. І падумала зняверанaя жонка: "От ты скажы, пракляў, халернік, хай бы ўжо дала яму сала".

*****

Бацька з сынам косяць траву. Прыйшла пара абедаць. Глянуў бацька на сенажаць ды кажа сыну:

- Але, сынок, нешта мы мала скасілі з табою.

- А што ты, бацька, хочаш, ты стары, а я малады.

Селі абедаць. І ўвесь абед хутка з'елі.

Бацька здзіўляецца:

- Бач, сынок, як мы ўміг торбу апаражнілі.

А сын кажа:

- А што ты, бацька, хочаш – двое мужчын!

*****

Спораўцы здаўна з возера жылі, рыбу лавілі. Аднойчы, калі хата гарэла, сучачка з яе выскачыла. На сучцы поўсць гарыць. І бяжыць яна, шукаючы паратунку, да возера.

То спораўцы хату кінулі тушыць, давай сучачку ад возера адганяць. Баяліся, што падпаліць.

*****

Адзін споравец любіў гандляваць. Паедзе ў Ружаны, накупляе часныку і прадае ў Бярозе на капейку даражэй. Аднаго разу нарваў на рэчцы качынцу, жоўты такі, паехаў у Бярозу з маці, расклаў на прылаўку, абабег вакол, а пасля падыходзіць да прылаўка і, як бы не ведаючы маці, як чужы, кажа:

- Ой, дзякуй, цётачка, ой, лячы людзей! Чатыры разы памыўся, дык усё рабацінне як рукой зняло!

Пачулі пра тое пакупнікі, набеглі, найбольш дзяўчаты. У момант размялі качынец.

*****

Прыехаў у Спорава з Разаншчыны чалавек, ганарысты такі. А сам кумяк (тоўчаную бульбу) убачыў, дык думаў, што масла – на хлеб намазваў.

*****

Заходзіць споравец у цырульню, каб пастрыгчыся. У яго пытаюцца:

- Як стрыгчы?

- А як вы ўмееце?

- Пад "канатку" і на "лыса"

- А як танней? – дапытваецца споравец

- На "лыса", - адказваюць яму

- Тады – стрыжы! – згаджаецца ён.

Пастрыглі. Глянуў у люстэрка. Не спадабаўся сам сабе. Просіць:

- Э-э, слухай, стрыжы мяне пад "канатку".

*****

Прыйшла спораўка да доктара і кажа:

- Прастудзілася я.

- Бо не хадзі з голымі пятамі.

Выйшла з пакоя жанчына і жаліцца людзям:

- Ці не дурны гэты доктар? У мяне прастуда, горла баліць. А ён мне кажа, бо ў цябе пяты голыя. Ну і што, што голыя! Дзе тая галава, а дзе тыя пяты!

*****

Спораўка бядуе суседцы, што карову купілі марную: усяго паўвядра малака дае.

- А ты ў якое вядро доіш? – пытаецца суседка.

- У дзесяцілітровае.

- Э-э-э, а ты дой у пяцілітровае, то будзеш мець цэлае вядро малака.

*****

Споравец-трактарыст здзіўляецца:

- Чаму гэта ўсе, як прыходзіць пара садзіць бульбу, да мяне на "вы" пачынаюць звяртацца, а калі я адчаплю ад трактара бульбасаджалку, то зноў на "ты"?

*****

Аднаго спораўца паставілі за вартаўніка ў калгасны сад. А калгаснікі, як на заданне, пайшлі латашыць яблыкі.

Ходзіць вартаўнік-споравец па садзе і крычыць:

- Цякай, цякай, а то я іду!

Гэты споравец-вартаўнік – добрай душы чалавек.

*****

Споравец да спораўца:

- Куды ідзеш?

- Ды вось ліст не дапісаў, пайду ў краму "чарніла" куплю, то дапішу.

*****

Споравец да спораўца:

- Ты чаго ў Бярозу едзеш?

- Ды вось муха ў вядро з вадой упала.

- Ну і што?

- Дык еду піва піць.

*****

Спораўка да спораўкі:

- Мой хлопец, мусіць, пісьменнікам будзе.

- Чаму?

- А ўсё рубель на чарніла просіць.

*****

Трактарыст-споравец прывез трактарам сена цётцы-ўдаве. Выпіў дзве бутэлькі ды кажа:

- А, я думаў, цётка, што ты мяне напоіш...

*****

Споравец разважае:

- Хто ў лазню ходзіць? Ды адны гультаі!

- Чаму?

- Бо лянуюцца чухацца.

*****

- Спораўцы саджаюць бульбу ноччу, - распавядае споравец.

- Чаму?

- А каб каларадскі жук не бачыў дзе.

*****

Яшчэ пра бульбу. Спораўцы кажуць:

- Без бульбы няма ходу, толькі жывот, як калода.

- Бульба смажана, пячона, бульба сёння, бульба ўчора.

**Показкі сабраў і прадаставіў да друку краязнавец Алесь ЗАЙКА, В. Заполле Івацэвіцкага раёна**

Рэха БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
№ 1 (3) ЖНІВЕНЬ 2009

Рэдактар: Павел ДАЙЛІД

- Кантактныя тэлефоны: +37529 522-82-30, +37529 992-28-30
- E-mail: dajlid@mail.ru
- Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
- Пры перадруку матэрыялаў бюлетэню спасылкі на крыніцу абавязковыя
- Наклад 299 асобнікаў

- Распаўсюджваецца бясплатна
- Падпісана ў друк 25.08.2009 г.
- Папера афсетная, фармат А4